**Упраўленне адукацыі Смаргонскага райвыканкама**
**Вучэбна-метадычная ўстанова «Смаргонскі раённы вучэбна-метадычны кабінет»**

# Пачатковая школа. Алімпіядныя заданні. Беларуская мова

## З вопыту работы

**Смаргонь 2011**

ББК 74.26-7
Г 82

**Аўтар:** Грышкевіч Т. Ю., Гурбан І. Ул., Клундук М. Ч.,
Кохан В. К., Марукевіч Л. Ст., Петух А. І.,
Ядзевіч І. З.

**Рэцэнзент:** Грыгарчук Ю. А., метадыст вучэбна-метадычнай установы «Смаргонскі раённы вучэбна-метадычны кабінет»

Г 82 **Пачатковая школа. Алімпіядныя заданні. Беларуская мова.**/ склад. Грышкевіч Т. Ю., Гурбан І. Ул., Клундук М. Ч., Кохан В. К., Марукевіч Л. Ст., Петух А. І., Ядзевіч І. З., - Смаргонь: ВМУ «РВМК», 2011.

У дапаможніку прадстаўлены займальныя і нестандартныя заданні, падабраныя ў адпаведнасці з праграмай па беларускай мове. Матэрыял згрупаваны па раздзелах і па ўзроўнях складанасці.

Прапануемы матэрыял можа быць выкарыстаны пры правядзенння алімпіяд, гуртковых заняткаў, факультатываў, а таксама для самастойнага вывучэння беларускай мовы.

Дапаможнік адрасуецца настаўнікам пачатковых класаў.

© Грышкевіч Т. Ю., 2011
© Вучэбна-метадычная ўстанова “Смаргонскі раённы вучэбна-метадычны кабінет”

# Уводзіны

Без маці Беларусі,
Без беларускай мовы
Вы будзеце сіротамі,
Вам стануць сцежкі вузкімі.

І ў радасці, і ў скрусе
Гарніце ў сэрцы словы,
Расціце беларусамі,
Расціце беларускамі.
*Р. Барадулін*

Сучасная сістэма адукацыі патрабуе ад дзяцей не толькі значнага аб'ёму ведаў па ўсіх прадметах, але і гатоўнасці да змен, да творчасці. Развіццё творчага патэнцыяла асобы павінна быць у цэнтры сучаснай адукацыі.

Апошнім часам актыўна праводзяцца пазаўрочныя мерапрыемствы, накіраваных на сістэматызацыю і паглыбленне ведаў школьнікаў. Адной з форм пазакласнай работы з'яўляецца алімпіяда. Алімпіяда развівае ў школьнікаў інтарэс да прадмета, прабуджае жаданне працаваць з дадатковай літаратурай, фарміруе навыкі самастойнай працы, дапамагае раскрыць творчы патэнцыял вучня, павышае якасць навучання.

У дадзеным дапаможніку прадстаўлены займальныя і нестандартныя заданні, падабраныя ў адпаведнасці з праграмай па беларускай мове. Матэрыял згрупаваны па раздзелах і па ўзроўнях складанасці.

Мэта дадзенага дапаможніка – пашырыць веды вучняў па беларускай мове, удасканаліць іх моўную культуру, зацікавіць вывучэннем роднай мовы. Прапануемы матэрыял можа быць выкарыстаны пры правядзенння алімпіяд, гуртковых заняткаў, факультатываў, а таксама для самастойнага вывучэння беларускай мовы.

# І. Арфаэпія. Фанетыка

…Ціха гучаць у мове маёй
Словы пяшчотныя,
Словы крынічныя,
Росныя.

Чуюцца ў ёй –
І грымотныя,
Зычныя.
Водгулле бітваў у іх
Разлягаецца грознае…
*Аляксей Зарыцкі*

## ІІІ узровень

1. ***Колькі разоў сустракаецца гук [ш] у скорагаворцы.***
   Мама мышка сушыла шышкі,
   мышка-малышка мыла лыжкі.

2. ***З дадзеных складоў складзіце прыказку і запішыце яе.***
   Ба, чыць, во, ка, да, лё, ка, а , ро, зум, яш, чэ , да, лей.

3. ***Пастаўце націск у словах.***
   Алфавіт, магазін, журавель, кіламетр, талент, беларусы.

4. ***Раздзяліце словы на групы па колькасці складоў.***
   Пенал, ваза, лямпа, абажур, пяро, аловак, парта, лінейка, стол, мыш, сшытак, пень.

5. ***Вызначце, колькі мяккіх зычных гукаў ва ўсіх словах сказа.***
   У небе засвяціліся першыя зоркі.

6. ***Вызначце колькасць гукаў і літар у словах.***
   Сур’ёзны - ____ літар, ____ гукаў
   надвор’е - ____ літар, ____ гукаў
   разводдзе - ____ літар, ____ гукаў
   дзядзька - ____ літар, ____ гукаў

зацішша - ____ літар, ____ гукаў.

7. ***Палічыце галосныя і зычныя гукі ў словах. Запоўніце табліцу.***

| Слова | Колькасць зычных гукаў | Колькасць галосных гукаў |
|---|---|---|
| пісьмо | | |
| дзверы | | |
| ад’езд | | |
| зялёная | | |
| мядзведзь | | |

8. ***Запішыце словы ў два слупкі:***
***1) словы, дзе ўсе зычныя гукі глухія.***
***2) словы, дзе ўсе зычныя гукі звонкія.***

Гульня, вярба, шапка, каса, кошка, зязюля, косіць, бульба.

9. ***Прачытайце прымаўкі. Адной рыскай падкрэсліце літары, якія абазначаюць звонкія гукі. Якія з іх абазначаюць парныя гукі? Падкрэсліце іх дзвюма рыскамі.***

Слова даражэй за золата.
Слова не верабей: выпусціш – не зловіш.

10. ***Падкрэсліце словы, у якіх паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й’].***

Сям’я, дзядзька, Ульяна, толькі, з’ехаў, пісьмо.

11. ***Колькі слоў можна ўтварыць з гукаў [ г ], [ ш ], [ д ], [ ч ], [ к ] ?***

12. ***У якіх словах на адну літару больш, чым гукаў ?***

Цень, палын, вольха, вугаль, тыдзень.

13. ***Выберыце назоўнікі, якія маюць толькі два склады.***

Спяванне, імя, акно, духмянасць, мора, сваякі.

14. ***Перастаўце склады ў дадзеных словах, каб атрымаліся новыя словы.***

Шына, палі, рама, ліса, кара.

15. ***Вызначце словы, у якіх выдзеленыя літары абазначаюць правільныя націскныя галосныя:***

Стар**ы**, сп**і**на, **а**ркуш, дак**у**мент, г**а**нак.

16. ***У якіх парах слоў выдзеленыя зычныя абазначаюць аднолькавы гук ?***

Пешахо**д**– самалё**т**, падка**з**аў – напі**с**аў, лы**ж**ка – пту**ш**ка, па**д**ручнік – **т**ысяча, зака**з** – перано**с**, **ж**олуд – сту**ж**ка, сусе**д**ка – пала**т**ка.

***17. Дапоўніце фанетычны разбор слова ясень .***

Ясень – … склады
я < [й`] – зычны, … , звонкі;
[а] – … , націскны;
с – [с`] – … , мяккі, … ;
е – [э] – галосны, … ;
н – [н`] – … , … , звонкі ;
ь – …
… літар, … гукаў.

18. ***У якіх словах усе зычныя гукі парныя па цвёрдасці-мяккасці?***

Зайчык, кветка, парашут, пятніца, ананас.

19. ***Якімі гукамі адрозніваецца гучанне выдзеленых слоў ?***

Са снегам шэпча *лыжа*,
Смятанку кошка *ліжа*.

***20. Якія словы няправільна падзелены на склады ?***

Слу-ха-й-це, со-ней-ка, люд-зі, спя-ва-ю, кра-соў-кі.

## IV узровень

1. ***Запішыце словы, у якіх побач знаходзяцца два галосныя гукі.***

   Мая, фотаапарат, лілея, паэма, алімпіяда, аэрадром, тэатр, песня.

2. ***Выпішыце словы, у якіх націск падае на другі склад.***

   Настаўнік, доктар, шавец, будаўнік, механік, мастак, слесар, таксіст, садоўнік, чыгуначнік, даярка, дырыжор.

3. ***Выпішыце словы, якія маюць аднолькавую колькасць гукаў.***

   Хутка, поўдзень, насіць, з’ява, лес.

4. ***Запішыце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.***

   Яблык, пісьмо, заданне, край, цягнік, станцыя, паэма, тэатр, пояс, сям’я, Вера, дзень, крылле, здароўе, вераб’і, раён.

5. ***Падбярыце пары да слоў, каб значэнне гэтых слоў залежала ад парных зычных па цвёрдасці-мяккасці.***

   Нос – …, воз – …, лук – …, мышка – …, батон – …, кот – … .

6. ***Адгадайце, што гэта за словы. Што агульнага ў значэнні гэтых слоў?***

   Дзннк, лнйк, пндзлк, сштк, лвк.

7. ***Выпішыце пары слоў, што адрозніваюцца адным гукам.***

   Рак поўз паўз барак,
   Сустракае рака грак:
   – Здароў, рак, дай руку,
   У раку завалаку.

8. ***Да наступных слоў падбярыце іншыя з парнымі***

***глухімі або звонкімі зычнымі.***

Жар – … , саліць – …, пот – …, дома –…, забраць – …, борт – …, бітон – …, галодны –…, там – …, ход – … .

9. ***Падбярыце да наступных слоў аднакаранёвыя з падоўжанымі зычнымі і запішыце іх парамі па ўзору.***

Крыло – крылле, навокал – …, багаты – …, адзець – …, плаваць – …, задаць – …, мучыць – …, чакаць – …, пытаць – … .

10. ***Змяняючы адну літару ў слове, ператварыць слова воўк у слова козы.***

Воўк – ____ – _____ – _____ – козы.

11. ***Выберыце з дадзеных словы, у якіх націск падае на першы склад.***

Камбайнер, супавы, гліняны, ранак, мігаць, кухонны, лічбавы.

12. ***Адгадайце вершаваную загадку пра літару. Запішыце тры словы з гукам, які абазначае гэта літара.***

Літара,
Як глянеш вочкам,
Быццам
Мяккі знак з кіёчкам.
Здагадаліся, сябры ?
Ну, канечне ж,
Гэта – … .

***13. Падлічыце, колькі разоў у вершы сустракаецца гук [а].***

Я ў лес прыходзіў сябрам,
Галінак не ламаў.
Быў рады гукам, фарбам,

Хадзіў, запамінаў.

***14. Перастаўце літары так, каб утварыліся словы, якія нагадаюць пра свята Купалле. Запішыце гэтыя словы.***
Эркча, кянво, ёкрцас, таел, вкетак .

15. ***У якіх словах ёсць няпарныя цвёрдыя зычныя гукі ?***
Шыпшына, вясна, верш, далонь, джала.

16. ***У якіх словах на дзве літары больш, чым гукаў?***
Альбом, дзень, лебедзь, апенькі, яблынька.

***17. Масленіца – свята, якое ўслаўляе сонца. Сімвалам сонца на свяце з'яўляецца гарачы румяны блін. З літар слова*** бліночак ***утварыце іншыя словы.***

18. ***Разгадайце лагагрыфы:***

Я – магутны звер лясны
Беларускай стараны.
**Р** адкінь – і (цуд дый годзе!)
Апынуўся я ў роце…

Я расту ў шырокім полі, –
Кветачкі блакітныя.
**К** прыставіш, – і міжволі
Стану дрэвам пышным я…

Жыллё для жывёл пад зямлёю
Запоўніцца можа вадою
І возерам казачным стаць,
Як літару **Ч** дадаць…

## V узровень

***1. Запішыце словы, якія вымаўляюцца так.***
[аччувай'у], [л'оччык], [й'астрап], [з'амл'а], [м'от], [с'амй'а], [вус'эн'], [дз'ац'ка], [б'ароска], [дошч].

2. ***Запішыце па два словы на кожную схему, каб яны гучалі так*** [грып], [плот], [л’эс] ***, але мелі рознае значэнне. Складзіце з кожным словам сказ.***

***3. Запішыце словы па-беларуску і пастаўце націск.***
верба – …, случай –…, имя –…, усы – …, библиотека – … .

4. ***Замяніце ў словах літары так, каб утварыліся новыя словы.***
Кара – …, … . Цень – …, … . Рака – …, … . Сок – …, … . Лес – …, … .

5. ***Выпішыце і затранскрыпіруйце ўсе словы, у якіх ёсць гук [й’], але няма літары й.***
Прыйшла, стаяць, расцвітае, зямля, завея, Ева, белай, люстра.

6. ***Прачытайце словы. Вымавіце гукі ў адваротным парадку. Запішыце новыя словы.***
Лі – …, куль – …, кот – … , толь – …, лета – …, лёс – … .

7. ***Змяняючы адну літару, ператварыце.***
-марскую буру ў атаку;
-жаночае імя ў пару года;
-рух чалавека ў прыродную з’яву.

8. ***У якіх 5 словах сто зычных ?***

9. ***Адкажыце на пытанні. Адказы запішыце.***
-Чым канчаюцца лета і зіма?
-Чым пачынаюцца вясна і восень?
-Чым канчаецца тыдзень?
-Што ў сярэдзіне вішні?

10. ***Прачытайце загадкі, разгадайце іх, спішыце. У дужках напішыце адгадкі. Зрабіце гука-літарны аналіз апошняга слова-адгадкі.***

а) Без **т** вада кіпіць, а з **т** вучань за ёю сядзіць.

б) Травою зелянее, кветкамі расцвітае, а як **п** дабавіць – зямлю будзе араць.

***11. Што трэба зрабіць, каб дадзеныя спалучэнні гукаў сталі словамі? Запішыце словы, якія ў вас атрымаліся.***

[к] [о] [б]
[г] [а] [т] [а]
[т] [у] [с]
[т] [э] [п] [а]
[к] [т] [о] [л]

***12. Значэнне якіх слоў з прыведзеных змяняецца са зменай месца націску?***

Сталы, прыклад, трава, каса, каралі.

***13. Зрабіце фанетычны разбор слова*** студзень**.**

***14. Выпішыце словы, у якіх гук [дж] вымаўляецца як адзін непадзельны гук.***

Ураджай, джала, паджылкі, гляджу, абуджаецца, аджаць.

***Выпішыце словы, у якіх гук [ дз`] вымаўляецца як адзін непадзельны гук.***

Дзякуй, дзеці, радзіма, адзначыць, студзень, дзве, падзямелле.

15. ***Як вядома, у беларускай мове абавязкова трэба ставіць над літарай ё дзве кропкі, іначай не заўсёды можна зразумець сэнс слова ў сказе. У якіх словах з***

***прапанаваных лексічнае значэнне зменіцца, калі не будзе кропак над літарай ё ?***
Лёд, ёсць, лёс, ёлка, мёд.

***16. Запішыце сказ, выкарыстоўваючы яго транскрыпцыю.***
[вос` гэта карц`інка л`эс н`оман хмурынка радз`імы май`ой` край`ав`іт]

## Адказы да раздзела "Арфаэпія. Фанетыка"

### III узровень

1. 7 (мы<u>ш</u>ка, су<u>ш</u>ыла, <u>ш</u>ы<u>ш</u>кі, мы<u>ш</u>ка-малы<u>ш</u>ка, лы<u>ж</u>кі).
2. Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей.
3. Алфаві́т, магазі́н, жураве́ль, кіламе́тр, та́лент, белару́сы.

**4.** Стол, мыш, пень (адзін склад).
Пенал, ваза, лямпа, пяро, парта, сшытак ( два склады).
Абажур, аловак, лінейка (тры склады).

**5.** 10 ( [н'], [б'], [с'], [в'], [ц'], [л'], [с'], [п'], [й'], [к'])

**6.** Сур'ёзны - _ 7__ літар, __8__ гукаў; надвор'е - __7__ літар, __8__ гукаў; разводдзе - _9__ літар, _ 7__ гукаў; дзядзька - __8__ літар, __5__ гукаў; зацішша - __ 7__ літар, __6__ гукаў.

**7.**

| Слова | Колькасць зычных гукаў | Колькасць галосных гукаў |
|---|---|---|
| пісьмо | 3 | 2 |
| дзверы | 3 | 2 |
| ад'езд | 4 | 2 |
| зялёная | 4 | 4 |
| мядзведзь | 4 | 2 |

**8.** 1) словы, дзе ўсе зычныя гукі глухія: шапка, каса, кошка, косіць.
2) словы, дзе ўсе зычныя гукі звонкія: гульня, вярба, зязюля, бульба.

**9.** С<u>л</u>о<u>в</u>а <u>д</u>а<u>р</u>а<u>ж</u>э<u>й</u> <u>з</u>а <u>з</u>о<u>л</u>ата.
С<u>л</u>о<u>в</u>а <u>н</u>е <u>в</u>е<u>р</u>а<u>б</u>е<u>й</u>: <u>в</u>ыпусціш – <u>н</u>е <u>зл</u>о<u>в</u>іш.

**10.** <u>Сям’я</u>, дзядзька, <u>Ульяна</u>, толькі, <u>з’ехаў</u>, пісьмо.
**11.** Нельга ўтварыць ніводнага слова.
**12.** Цень, вольха, вугаль.
**13.** І-мя, ак-но, мо-ра.
**14.** Нашы, ліпа, мара, салі, рака.
15. Стары́, спі́на, а́ркуш, га́нак.
16. Пешахо**<u>д</u>** – самалё**<u>т</u>** – [т], лы**<u>ж</u>**ка – пту**<u>ш</u>**ка – [ш], зака**<u>з</u>** – перано**<u>с</u>** – [с], сусе**<u>д</u>**ка – пала**<u>т</u>**ка – [т].
**17.** Я́сень – 2 склады;
я < [й`] – зычны, мяккі, звонкі;
[а] – галосны, націскны;
с – [с`] – зычны, мяккі, глухі;
е – [э] – галосны, ненаціскны;
н – [н`] – зычны, мяккі, звонкі ;
ь – [-]
5 літар, 5 гукаў
**18.** Кветка, ананас.
**19.** Словы адрозніваюцца двума гукамі: [л] – [л`], [ы] – [і].
20. Слу-хай-це, лю-дзі.

## IV узровень

**1.** Фотаапарат, паэма, аэрадром, тэатр.
**2.** На-ста́ў-нік, ша-ве́ц, ме-ха́-нік, ма-ста́к, та-ксі́ст, са- до́ў-нік, чы-гу́-на-чнік, да-я́р-ка.
**3.** Хутка (5 гукаў), насіць (5 гукаў), з’ява (5 гукаў).
**4.** Пісьмо (6 літар, 5 гукаў), заданне (7 літар, 6 гукаў), дзень (5 літар, 3 гукі), крылле (6 літар, 5 гукаў).
**5.** Нос – нёс, воз – вёз, лук – люк, мышка – мішка, батон – бітон, кот – кіт.
**6.** Дзённік, лінейка, пэндзлік, сшытак, аловак – школьныя прылады.

**7.** Рак – <u>г</u>рак, п<u>о</u>ўз – п<u>а</u>ўз, р<u>а</u>ку – р<u>у</u>ку.
**8.** Жар – шар, саліць – заліць, пот – бот, дома – Тома, забраць – сабраць, борт – порт, бітон – пітон, галодны – халодны, там – дам, ход – год.

9. Крыло – крылле, навокал – наваколле, багаты – багацце, адзець – адзенне, плаваць – плаванне, задаць – заданне, мучыць – мучэнне, чакаць – чаканне, пытаць – пытанне.
**10.** Воўк—во**с**к—вос**ы**—**к**осы—ко**з**ы.
**11.** Су́павы, ра́нак, лі́чбавы.
**12.** Літара **ы.** **С**ад**ы**, д**ы**м, м**ы**шка.
**13.** 15 разоў: я, сябрам, галінак, ламаў, рады, гукам, фарбам, хадзіў, запамінаў.
**14**. Рэчка, вянок, касцёр, лета, кветка.
15. Шыпшына, верш, джала.
16. Дзень, лебедзь.
17. Блін, бочка, ноч, ночка, кіно, кліч, чан, бак, бок, клін.
18. Зубр – зуб, лён – клён, нара – Нарач.

## V узровень

**1.** Адчуваю, лётчык, ястраб, зямля, мёд, сям’я, вусень, дзядзька, бярозка, дождж.
**2.** Я зрабіў прышчэпку, грып мне цяпер не страшны. Баравік – самы смачны грыб.
Высокі плот быў вакол дома. На яблыні нізка вісеў плод.
Лес цёмнай сцяной абступіў вёску. Паўлюк лез у самы гушчар.
**3.** Верба – вярба́, случай – выпа́да, имя – імя́, усы – ву́сы, библиотека – бібліятэ́ка.
**4.** Кара – мара, пара. Цень – пень, дзень. Рака – рама, рана. Сок – бок, мок. Лес – леў, лез.
5. Стаяць – [стай’ац’], расцвітае – [рас’ц’в’ітай’э], завея – [зав’эй’а], Ева – [й’эва].
**6.** Лі – іл, куль – люк, кот – ток, толь – лёд (лёт), лета – атэль, лёс – соль.
**7.** Шторм – штурм; зіна – зіма; паходка – паводка.
**8.** Стол, стог, столь, стоп, стос.
9. Словы лета і зіма заканчваюцца галосным гукам [а] (літарай а).
Словы вясна і восень пачынаюцца з літары в.

Слова тыдзень заканчваецца літарай ь (мяккім зычным гукам [н’]).

У сярэдзіне слова вішня пішацца літара ш (чуецца гук [ш]).

**10.** а) Пара – парта. б) Луг – плуг.

Плуг – 1 склад;

п – [п] – зычны, глухі, цвёрды

л – [л] – зычны, звонкі, цвёрды

у – [у] – галосны, націскны

г – [х] – зычны, глухі, цвёрды

4 літары, 4 гукі.

**11.** Бок; агат; суд; этап, паэт; толк.

**12.** Ста́лы – сталы́, пры́клад – прыкла́д, ка́са – каса́, кара́лі – каралі́.

**13.** Сту́дзень – 2 склады;

с – [с] – зычны, цвёрды, глухі;

т – [т] – зычны, цвёрды, глухі;

у – [у] – галосны, націскны;

д> [дз`] – зычны, мяккі, звонкі;

з

е – [э] – галосны, ненаціскны;

н – [н`] – зычны, мяккі, звонкі;

ь – [-]

8 літар, 6 гукаў .

**14.** Ураджай, джала, гляджу, абуджаецца.

Дзякуй, дзеці, радзіма, студзень, дзве.

**15.** Ёсць, лёс, ёлка.

**16.** Вось гэта карцінка – лес, Нёман, хмурынка – радзімы маёй краявід.

## II. Словаўтварэнне

Зжылася з зямлёю, у дрэвы ўрасла,
Перапляласся з травою і кветкамі
Родная мова старога сяла,
Ад іншых сваёй цеплынёю адметная…
*Ларыса Геніюш*

## III узровень

1. ***Знайдзіце і выпішыце з кожнага радка роднасныя словы.***
а) Жолуд, жалудовы, жоўты;
б) водныя, вадзіць, вадзічка;
в) гара, горны, узгорак, горн.

***2. Якія словы ўтвораны з дапамогай прыстаўкі?***
Паглядзець, глядач, крыкун, закрычаць, крыкнуць.

***3. Якія словы ўтвораны з дапамогай суфікса?***
Прыклеіць, пераскочыць, вясёленькі, марозны, унесці.

***4. Выпішыце пары аднакарэнных слоў.***
Прададзены – аддадзены, радок – другарадны, сляза – злазіць, камень – каменялом, левы – лівень.

***5. З кожнага рада выпішыце словы з аднолькавым канчаткам.***
а) Дамоў, сталоў, кароў;
б) плячэй, батарэй, вушэй.

6. ***Разбярыце словы па саставе.***
а) Прыколка, абвестка, згустак, падвячорак, нескладуха, безліч, метро.
б) Падказка, прынёс, лядок, прысмакі, цёплы, грыбочкі, навіслі, беразняк.
в) Непаўналетні, перабудова, занямела, верасовы, праезд, разбудзім.
г) Саломінка, акцёрскі, маліннік, выпрацоўка, галоўка, забарона.
д) Веснавы, дакладчык, прыдарожны, раніца, узгоркі, водны, падводная.

7. ***Пры дапамозе суфіксаў утварыце аднакаранёвыя прыметнікі, разбярыце іх па саставу.***
Мора – ..., зіма – ..., школа – ..., кніга – ..., ноч – … .

8. ***Утварыце аднакаранёвыя словы пры дапамозе прыставак*** аб-, ад-, над-, пад- ***. Запішыце.***
Рэзаць, біць, сыпаць.

9. ***Прачытайце аднакарэнныя словы. Да кожнага слова запішыце указаныя значэнні.***
1) Варэнік, 2) варыва, 3) повар, 4) варэнне.
а) Гарачая вадкая страва; б)маленькі вараны піражок; в) ягады ці плады, звараныя ў цукры; г) майстар па прыгатаванню ежы.

10. ***Выпішыце лішнія словы.***
Зварка, вар, говар, повар.
Нос, пераносіца, насып, насоўка.
Гадок, год, гадавы, загадка.

11. ***Знайдзіце словы, якія не адпавядаюць схемам.***
а) “Корань+суфікс+канчатак”: прыгарадны, рака, летні, школьны.
б) “Прыстаўка+корань+канчатак”: заробкі, рыбак, пералётны, ножка.

12. ***Знайдзіце ў сказах аднакаранёвыя словы і разбярыце іх па саставе.***
Асцярожная ласіха, не шукаючы дарог, ласянят вядзе бязрогіх да ракі Ласёвы Рог.
Заспявалі, загукалі лес і пералескі. Засінелі, зажаўцелі лотаць і пралескі.
Мухалоў і мухалоўка ловяць мух і мушак лоўка.

## IV узровень

1. ***Запішыце пяць дзеясловаў, будова якіх адпавядае схеме*** “прыстаўка+корань+суфікс+канчатак”.

2. ***Будова якіх прыслоўяў адпавядае схеме*** “ корань +

суфікс”**?**
Весела, цёпла, дахаты , улетку, унізе.

3. ***Запішыце тры словы, будова якіх адпавядала б схеме*** “прыстаўка + корань+суфікс”.

4. ***Утварыце ад дадзеных слоў новыя з падоўжанымі зычнымі.***
Акно, восень, конь, агонь.

5. ***Утварыце назоўнікі пры дапамозе суфіксаў*** -чык-, -шчык-, -аньк-, -еньк-.
Вагон – …, сігнал – …, дыван – ..., паром – ..., вішня – ..., ручка – ..., песня – ... .

6. ***Выпішыце словы, якія складаюцца толькі з кораня.***
Забег, залп, запас, завал, занос, заяц.

7. ***У якіх словах ёсць суфікс?***
Грыбнік, гарадскі, шышка, бярозка.

8. ***Выпішыце словы, у якіх ёсць прыстаўка.***
Дагарэў, дабрыня, давайце, дапісала, дачытайце.

9. ***Укажыце, дзе правільна пазначаны марфемы ў слове*** ручаіна**:**
а) руч-а-ін-а, б) руч-аін-а, в) руча-ін-а , г) руча-і-н-а, д) ручаі-н-а.

10. ***Да слоў падбярыце і запішыце аднакарэнныя словы, якія адпавядаюць наступнай схеме:*** “прыстаўка+ корань+ суфікс+ канчатак”.
Казка, зямля, вада, горад.

***11. Запішыце адказы на пытанні адным словам. Абазначце суфіксы.***
- Як назваць снег ласкава?

- Як назваць снегавую зорачку?
- Як у народнай казцы называецца дзяўчынка, якая злеплена са снегу?
- Як называецца птушка, якая прыляцела да нас з надыходам халадоў?

***12. Дапішыце словы з дапамогай прыставак.***

..спрэчны, ..злавацца, ..святочны, ..грызці, ..месці, ..лезці.

***13. Устаўце словы як патрабуе сэнс. Спішыце і абазначце суфіксы і прыстаўкі.***

Пчол даглядае … . Сцены фарбуе … . Цэглу кладзе … . Карціну піша … . Пажар тушыць … . Кнігі пераплятае … .

***14. Да слоў падбярыце роднасныя словы. Абазначце суфіксы.***

а) Назоўнікі мужчынскага роду.
Рука – … , страва – …, будоўля – …, маўчанка – … .
б) Назоўнікі жаночага роду.
Дождж – …, гаспадар – … , шпак – … , госць – … .

15. ***Да слова*** баравік ***падбярыце роднасныя словы. Абазначце корань.***

***16. Запішыце па два словы да кожнай схемы:***

1) “корань+ канчатак” ;
2) “корань+суфікс+канчатак” ;
3) “прыстаўка+корань+канчатак”;
4) “прыстаўка+корань+суфікс+канчатак”.

***17. Знайдзіце ў кожным радку роднасныя словы, выдзеліце ў іх корань.***

а) Пясчаны, пясцовы, супесак, песціць.
б) Замок, мокнуць, макаць, змыкацца.

в) Сярэдзіна, сэрца, сярдзіты, сэр.
г) Заём, узяць, узняць, займаць.
д) Прыяцель, прыняць, здымак, абойма.
е) Мільгаць, мілы, памілаваць, міліцыя.

18. ***Утварыце назоўнікі пры дапамозе суфіксаў*** -ок- (-ак-), -ік- (-ык-).

Лес – … , кот – … , дуб – … , двор – … , шар – … , конь – … , камар – … , сыр – … , замок – … .

## V узровень

1. ***Якія карані прапушчаны ў словах? Дапішыце словы.***
___ ок, _____нік, ______ка, _____овы,______ны.

2. ***Дапішыце да дадзеных слоў па два словы з такім самым складам.***
Стол, …, … ; паездка, …, … ; палёт, …, … ; мосцік, …, … .

***3. Выпішыце словы з прыстаўкай*** пад-.
Падбегчы, падарунак, падасінавік, падабрэць, падаконнік.

***4. Утварыце і запішыце па 2 словы з прыстаўкамі*** з-, па-, без-, пад-, пры- **.**

5. ***Запішыце, ад якіх слоў і пры дапамозе якіх суфіксаў утвораны словы.***
Лімонны, гарадскі, радасны.

6. ***Ад слоў*** мора, грузіць, музыка ***ўтварыце назвы прафесій.***

7. ***Ад якіх слоў можна ўтварыць новыя словы з памяншальна-ласкальным значэннем? Новыя словы***

***запішыце.***
Дарога, сад, вясёлы, курыны.

8. ***Замяніце прыметнікі іншымі, блізкімі па сэнсе прыметнікамі з прыстаўкамі*** без-, бяз-, бес-**.**
Яснае неба – … неба, жорсткі вораг – … вораг, правільны адказ – … адказ.

9. ***Запоўніце клеткі словамі з коранем*** вад –

| | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 2 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 3 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 4 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 5 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 6 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 7 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 8 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 9 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 10 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 11 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 12 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 13 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 14 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 15 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 16 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 17 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 18 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 19 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |
| 20 | в | а | д | | | | | | | | | | | | | |

10. ***Падбярыце назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, каб у кожным з іх былі прыстаўка, корань, суфікс і канчатак. Разбярыце іх па саставе.***

11. ***Да назваў зімовых месяцаў падбярыце як мага больш аднакарэнных слоў. Вызначце корань.***

***12. Да назваў летніх месяцаў падбярыце як мага больш аднакарэнных слоў. Вызначце корань.***

13. ***Да назваў восеньскіх месяцаў падбярыце як мага больш аднакарэнных слоў. Вызначце корань.***

***14. Да назваў веснавых месяцаў падбярыце як мага больш аднакарэнных слоў. Вызначце корань.***

15. ***Утварыце як мага болей дзеясловаў з коранем*** -бег- ***пры дапамозе прыставак.***

***16. Складзіце і запішыце чыстагаворкі.***
Ры-ры-ры …
Ла-ла-ла …
Чы-чы-чы …

***17. Гульня "Хто больш?". Запішыце словы, якія б заканчваліся на жаночае імя "Іна".***

**1*8. Запішыце словы, якія маюць па два корні. Вызначце корні.***

19. ***Ад наступных слоў утварыце назоўнікі трох родаў. Вызначце корні.***
Воўк - … , … , мядзведзь - … , … , ліс - … , …,
лось - … , … , заяц - … , … , алень - … , … .

***20. Адгадайце метаграмы.***
а) З глухім траву яна зразае,
Са звонкім – лісце аб'ядае.
б) З глухім я круглы, нібы мячык,
Са звонкім – як агонь, гарачы.
в) З "л" – інструмент я, прылада;

З “д” я – вялікая хата;
З “с” – мяне ловіць рыбак;
З “к” я – вялікі камяк;
З “т” – мяне, пэўна, чытаў.
Хто я такі – адгадаў?
г) З “б” – на му́ку я тваю;
З “м” – я футра папсую;
З “т” – дамы́ я пакрываю;
З “с” – у страве я бываю.

## Адказы да раздзела “Словаўтварэнне”

### III узровень

**1.** а) Жолуд, жалудовы;
б) водныя, вадзічка;
в) гара, горны, узгорак.
**2.** **Па**-глядзець, **за**-крычаць.
**3.** Вясёл-**еньк**-і, мароз-**н**-ы.
**4.** Радок – другарадны, камень – каменялом.
**5.** а) Дам-**оў**, стал-**оў**; б) пляч-**эй**, вуш-**эй**.
**6.** а) Пры-кол-к-а, аб-вест-к-а, з-густ-ак, пад-вячор-ак, не-склад-ух-а, без-ліч, метро.
б) Пад-каз-к-а, пры-нёс, ляд-ок, пры-смак-і, цёпл-ы, грыб-оч-к-і, на-віс-л-і, бераз-няк.
в) Не-паўн-а-лет-н-і, пера-буд-ов-а, за-ням-е-л-а, верас-ов-ы, пра-езд, раз-будз-ім.
г) Салом-ін-к-а, акцёр-ск-і, малін-нік, вы-прац-оў-к-а, галоў-к-а, за-барон-а.
д) Весн-ав-ы, даклад-чык, пры-дарож-н-ы, ран-іц-а, уз-гор-к-і, вод-н-ы, пад-вод-н-ая.
**7.** Мора – мар-ск-і, зіма – зім-н-і, школа – школь-н-ы, кніга – кніж-н-ы, ноч – нач-н-ы.
**8.** Абрэзаць, адрэзаць, надрэзаць, падрэзаць.
Аббіць, адбіць, надбіць, падбіць.
Абсыпаць, адсыпаць, надсыпаць, падсыпаць.
**9.** 1 – б; 2 – а; 3 – г; 4 – в.

**10.** Говар, насып, загадка.
**11.** а) Пры-гарад-н-ы, рак-а.
б) За-роб-к-і, рыб-ак, пера-лёт-н-ы, нож-к-а.
12. Лас-іх-а, лас-ян-ят, Лас-ёв-ы.
Лес, пера-лес-к-і, пра-лес-к-і.
Мух-а-лоў, мух-а-лоў-к-а, мух, муш-ак.

## IV узровень

**1.** На-пар-нік-і, рас-цер-л-а, пры-гарад-н-ы, пера-пудж-ан-ы, па-езд-к-а.
**2.** Весел-а, цёпл-а.
**3.** Уз-гор-ак, па-дар-унак, пера-лес-ак.
**4.** Аконны, асенні, конны, вогненны.
**5.** Вагончык, сігнальшчык, дыванчык, паромшчык, вішанька, ручанька, песенька.
**6.** Залп, заяц.
**7.** Грыб-**н-ік**, гарад-**ск**-і, шыш-**к**-а, бяроз-**к**-а.
**8.** Дагарэў, дапісала, дачытайце.
**9.** в) Руча-ін-а.
**10.** Казка – пры-каз-к-а, зямля – пад-зем-н-ы, вада –пад-вод-н-ы, горад – пры-гарад-н-ы.
11. Сняжок. Сняжынка. Снягурка. Снягір.
12. Бясспрэчны, раззлавацца, перадсвяточны, падгрызці, падмесці, залезці.
13. Пчол даглядае пчал-**яр**. Сцены фарбуе маляр. Цэглу кладзе муляр. Карціну піша мастак. Пажар тушыць пажар-**н-ік**. Кнігі пераплятае **пера**-плёт-**чык**.
**14.** а) Руч-**н-ік**, с-траў-**нік**, буд-**аў-нік**, маўч-**ун**.
б) Дажджы-**ын-к**-а, гаспад-**ын**-я, шпак-**оўн**-я, госц-**ейк**-а.
**15. Бор**, **бар**авы, **бар**авіна, **бар**авінка, **бар**авіковы, **бар**авічок.
**16. -\\-**
**17.** а) **Пясч**аны, су**песак**.
б) **Мок**нуць, **мак**аць.
в) –
г) **Заём**, **займ**аць.
д) –

е) **Міл**ы, па**міл**аваць.

**18.** Лясок, каток, дубок, дворык, шарык, конік, камарык, сырок, замок.

**V узровень**

1. **Сняж**ок, **ляс**нік, **бяроз**ка, **сад**овы, **вод**ны.
2. Стол – мост, звер; па-езд-к-а – пад-нож-н-ы, пера-воз-к-а; па-лёт – за-нос, у-верх; мосц-ік – сад-ок, стол-ік.
3. **Пад**бегчы, **пад**асінавік, **пад**аконнік.
4. **З**лез, звязаць; **па**садзіць, **па**спявае; **без**зямелле, **без**дарожжа; **пад**возчык, **пад**клеіць; **пры**несці, **пры**ляцець.
5. Лімонны – лімон, -**н**-; гарадскі – горад, -**ск**-; радасны – радасць, -**н**- .
6. Мора – марак, грузіць – грузчык, музыка – музыкант.
7. Дарога – дарожка, дарожанька, дарожачка; сад – садок, садзік, садочак; вясёлы – вясёленькі.
8. Яснае неба – **бяз**воблачнае неба , жорсткі вораг – **бяз**літасны вораг, правільны адказ – **бес**памылковы адказ.
9. 1-вада, 2-вадкі, 3-вадаём, 4-вадзяны, 5-вадасцёк, 6-вадакачка, 7-вадазліўны, 8-вадамершчык, 9-вадародзісты, 10-вадаёмістасць, 11-вадохрышчанскі, 12-вадкакрышталічны, 13-вадкаметалічны, 14-вадасховішчны, 15-ваданоснасць, 16-вадазборнік, 17-вадаспадны, 18-вадалазны, 19-вадкасць, 20-вадапой.
10. Пад-піс-к-а, пры-мор-ск-і, за-зелян-е-л-а.

**11 – 16** - \\ -

**17.** Яліна, маліна, каліна, галіна, даліна, Ніна, Яніна, Ліна, Паліна, маміна… .

**18.** **-** \\ -

**19.** **Воўк** – **ваўч**ыца (**ваўч**ыха), **ваўч**аня (**ваўч**анё).
**Мядзведзь** – **мядзведз**іца (**мядзведз**іха), **медзведз**яня (**медзведз**янё).
**Ліс** – **ліс**іца, **ліс**яня (**ліс**янё).
**Лось** – **лас**іха, **лас**яня (**лас**янё).

**Заяц** – **зайч**ыха, **зайч**аня (**зайч**анё).

**Алень** – **ален**іха, **ален**яня (**ален**янё).

**20.** а) Каса – каза. б) Шар – жар. в) Лом – дом – сом – ком – том.
г) Боль – моль – толь – соль.

## ІІІ. Лексіка

Слова – радасць, слова – чары,
Вобраз вечна юных вёсен,
Ёсць ты ўсюды: у сонцы, у хмары,
Ты глядзіш праз неба просінь.

Лашчыш слух мой, слова-ззянне,
Атуляеш сэрца ласкай,
Ноч і вечар, дзень, світанне
Абняло ты, слова-краска.
*Якуб Колас*

### ІІІ узровень

***1. Выберыце правільныя адказы на пытанні.***

1) Што адгукаецца, але не паказваецца?
   а) Радыё
   б) Рэха
   в) Магнітафон
   г) Вецер
   д) Прыёмнік

2) Што ляціць без крылаў?
   а) Самалёт
   б) Самакат
   в) Вецер
   г) Пчала
   д) Паперка
   е) Сняжынка

3) Што гарыць без полымя?
   а) Дровы
   б) Лямпачка

в) Сонца
г) Свечка
д) Ліхтарык
е) Папера

***2. Закончыце прымаўкі і прыказкі.***

Не той сябар, хто мёдам мажа, а той...
Як прывітаешся, так і ...
Ласкавае слова – што...

***3. Злучыце лініямі словы са словамі з супрацьлеглым значэннем.***

| | |
|---|---|
| злосны | смелы |
| баязлівы | мяккі |
| мірны | кароткі |
| доўгі | высокі |
| нізкі | ваенны |
| цвёрды | добры |

***4. Выберыце са слоў сінонімы да дадзеных слоў.***

Хадзіць ( бегаць, крочыць, лётаць, шкандыбаць, плаваць).
Рэшата ( карыта, сіта, каструля, посуд).
Радасць ( здзіўленне, пачуццё, весялосць, сум).
Працоўны ( працавіты, рабочы, старанны).

***5. Злучы словы з іх значэннямі .***

| | |
|---|---|
| сіло | птушка |
| ганчар | незамерзлы ўчастак ледзяной паверхні вадаёма |
| амялушка | вялікі камень |
| валун | чалавек, які робіць вырабы з гліны |
| палонка | пятля для лоўлі птушак і дробных жывёл |

***6. Растлумачце сэнс слоў.***

Хлеб, чарніцы, памідор, аўтобус .

***7. Выпішыце словазлучэнні, якія ўжыты ў пераносным значэнні.***

Залаты пярсцёнак, глыбокія веды, крохкі лядок, залатое сэрца, глыбокае возера, чорны дзяцел, крохкі хлеб, лясныя сцежкі, калючы мароз.

8. ***Растлумачце ўсе значэнні слова*** іголка.

9. ***Выберыце словы, якія можна спалучыць са словам <u>буйны.</u>***

Бусел, авёс, дуб, саўгас, сшытак.

***10. З дапамогай слоў для даведак перакладзіце словы на беларускую мову.***

Крыса, пачка, бровь, лицо, лопата, диван, карандаш, луч, висок.

<u>11.</u> ***Выпішыце сінонімы да слова*** лес.

Напоўніць лес птушыны свіст, травою луг акрыецца. У першы раз пушча чула такія гукі. Далей – глуш, цішыня ў бары за гарой, - каб галінка адна хоць кіўнула сабой. Ачнецца гай і з песнямі ў зялёны ліст адзенецца.

***12. Устаўце прапушчаныя антонімы.***

Работы многа, а толку …. .
Дождж намачыў, а сонейка …. .
Хто чужога не шануе, той … не мае.
Любіш узяць – любі і … .

***13. Падбярыце да слоў антонімы.***

Актыўны –
Уважлівы –
Таленавіты –
Хлуслівы –
Скупы –

***14. Запішыце словазлучэнні і падкрэсліце ўжытыя ў прамым значэнні.***

Узяць кнігу, узяць курс на поўнач, узяць умацаванні, узяць у дужкі, узяць слова, узяць прыцэл, узяць на ўлік.

***15. Дапішыце ў сказы антонімы.***

Дуб тоўсты, а сасна … .
Самалёт паднімаецца, а парашутыст … .
Халоднае надвор’е змянілася … .
На кожную загадку ёсць … .

***16. Выпішыце словы – сінонімы.***

Валошка, васілёк, дзьмухавец.
Загад, каманда, камандаванне, распараджэнне.
Ліпавы, ліпкі, клейкі.

***17. Выпішыце антонімы.***

Моцная рука пана над яго мастацтвам была і салодкая, і горкая. Салодкая тым, што кідала жмені залатых дукатаў налева і направа.

***18. Адгадайце, што гэта. Дапішыце назоўнікі.***

Чыстая, празрыстая, студзёная, смачная -...
Густы, зялёны, цяністы-...
Ранняя, жаданая, цёплая- ...
Белы, салодкі, смачны- ...
Умелая, дбайная, працавітая, старанная- ...
Белы, халодны, рыхлы -...

## IV узровень

***1. Якія словы “ хаваюць” у сабе агародніну і назвы нот?***

***2. Закончыце прыказкі.***

Будзе і на крапіву... .
Як навучышся, так і... .
Сапраўдны сябар ... .
Хто працуе, той ... .
Сем разоў адмерай - ... .

***3. Што робяць:***

маляр -

цясляр –

бондар –

машыніст –

муляр –

***4. Адкажыце на пытанні.***

Пра якую жывёлу кажуць, што яна мае хвост, як у рыбы, а заднія лапы, як у качкі?

Якія ягады маюць чырвона-чорны з бурштынавым бляскам колер і салодка-гаркавы смак?

Якую кветку па-другому называюць валошка?

Як называецца электрапрыбор для разгладжвання тканіны?

***5. Перакладзіце словы на беларускую мову.***

Капля, зеркало, утро, сентябрь, обои, сирень, клюква, кролик, сахар, конфета.

***6. Падбярыце сінонімы да слоў.***

Смяецца, шпарка, паклікаць, сцюдзёны, мяцеліца, поезд, страха, волат, балота, спакойны, змоўкнуць.

7. ***У якіх значэннях ужываецца слова*** зорка***. Запішыце словазлучэнні.***

***8. Падбяры антонімы да наступных прыметнікаў.***

сумны –

халодны –

лянівы –

прыгожы –

моцны –

шумны –

9. ***Знайдзіце ў сказах амонімы і падкрэсліце.***

Тата з цікавага падарожжа прывёз мне гасцінец.
Летам чуваць здалёк , як звіняць косы.

***10. Замяніце выдзеленыя словы сінонімамі, якія больш адпавядаюць сэнсу выказвання.***

Веданне **чужаземных** моў адкрывае перад чалавекам шырокія перспектывы. Нашы рэкі і азёры славяцца **процьмай** рыбы. На горад павольна находзіла **хмурая** ноч. Хлопчыка апанаваў **змрочны** настрой.

***11. Выпішыце “лішнія” словы.***

Адчай, горыч, роспач, пачуццё, гора.
Недагарак, галавешка, чурбан, агарак, асмалак.
Філосаф, мысліцель, мудрэц, чалавек.

***12. Утварыце словазлучэнні, спалучыўшы словы, што ў дужках, з дзеясловам і прыметнікам. Словазлучэнні з пераносным значэннем слоў падкрэсліце.***

Патушыць (свечка, пажар, спрэчка).
Маўклівы (чалавек, лес, дзіця).
Празрысты (шкло, воблака, погляд).

***13. Спішыце сказы, выкарыстоўваючы адзін з сінонімаў, што ў дужках.***

У музеі сабраны ( старыя, старадаўнія) рэчы. Ля дарогі стаяла (старая, старадаўняя) бяроза. Мне трэба ( вырваць, выцягнуць) зуб. Лодку (вырвалі, выцягнулі) з вады.

***14. Выпішыце словы, якія абазначаюць адно і тое ж дзеянне ці прымету.***

І ўсё прыціхла, анямела, што непакоіла раней.
Але раса – аж адчуваецца за спінаю – яшчэ халодная, сцюдзёная.
Яна тады нешта б прыдумала, нешта б змаргеліла, каб павярнуць усё ў лепшы бок.

***15. Спішыце, замяняючы выдзеленыя словы антонімамі.***

а) Увосень, калі ў лесе жаўцее лісце, мне рабілася **сумна** ад таго, што сонца як быццам **слабела**, рабілася **нядужым**. **Цяжка** быць у полі са статкам у **пахмурны** дзень.

б) Надышло **гарачае** лета. **Цёплы** ветрык **разганяў** хмары, і яны **рэдка** ўкрывалі неба. У поўдзень сонца плыло па небе **высока** і пасылала **цёплыя** прамяні.

***16. Выпішыце сказы, у якіх словы ўжыты ў пераносным значэнні.***

Бялявыя вусы былі заядла падкручаны ў дзядулі. А там ячмень тапырыць свае калючыя вусы.

Беглі салдаты з насілкамі і лапатамі. Беглі дні, і памалу канчалася восень.

***17. Утварыце словазлучэнні са словамі ў прамым і пераносным значэнні.***

Кіпіць, залаты, клас, галоўка, светлыя.

***18. Падбярыце да слоў словы з супрацьлеглым значэннем і запішыце.***

Стары паляўнічы - …
Стары дом - …
Свежае паветра - …
Свежы хлеб - …

19. ***Падбяры і запішы да слоў антонімы.***

Ноч, гара, гарачыня, раніца, хвароба, маладосць, захад, вайна, бядняк, смутак.

20. ***"Збярыце" прыказкі.***

Новых сяброў набывай; як салавей без песні; гультай за работу; а чалавек уменнем; дзе няма ведаў; той свайго не мае; а старых не забывай; ды хлеб ад яе салодкі; там не будзе смеласці; мазоль за руку; прыгожая птушка пер'ем; чалавек без Радзімы; горкая часам праца; хто чужога не шануе; там і

пад елкай рай; а той, хто шмат вучыўся; ідзі ў родны край; не той шмат ведае, хто доўга жыў.

21. ***Складзіце словазлучэнні, у якіх словы*** залаты, салодкі, цвёрды ***былі б ужыты ў пераносным значэнні.***

## V узровень

***1. Пазнайце слова па яго лексічным значэнні. Запішыце яго.***

а) Пакрывала для стала.

б) Прыстасаванне для засцярогі ад дажджу і сонца: круглы кавалак тканіны, нацягнуты на спіцы, якія прымацаваны да доўгай ручкі.

в) Рознакаляровая дугападобная палоска на небе, якая ўтвараецца ад пераламлення прамянёў у кроплях дажджу.

г) Рыбны суп.

д) Прадмет, які выстаўляецца ў музеі або на выстаўцы для агляду.

***2. Перакладзіце тэкст на рускую мову. Запішыце яго.***

Вясна прыйшла неяк раптоўна. Сонца ўзнялося над лесам. Яно шырока расплюшчыла вочы. Адразу з узгоркаў пабеглі ручайкі. На рэчцы пачаўся крыхаход. На схілах берагоў паказаліся чорныя плямы. Зямля ўздыхнула пасля доўгага сну.

***3. Падбярыце да слоў сінонімы.***

Грандыёзны –
Маланка –
Угледзець –
Цягнуць –
Імчаць –
Звініць –

4. ***Растлумачце значэнне слоў.***

Луста, жальба, лучына, кірмаш, калектыў, шклянка, хустка.

5. ***Перакладзіце на беларускую мову.***

Вечером в лесу

Тёмные тени лежат под деревьями. Неподвижно стоят старые сосны, чернеют густые ели. Пахнет в лесу смолой, сосновой хвоей, осенней опавшей листвой. Скрылось за вершинами вечернее низкое солнце. Ещё не спят жители леса. Вот на стволе дерева уселся чёрный дятел, начал долбить дерево. Вокруг него вертятся шустрые синички, подбирают жучков и червячков. Скоро наступит чёрная ночь. Замолкнут и заснут дневные птицы и звери.

6. ***Вызначце “лішняе”.***

Самыя значныя рэкі Беларусі – Днепр, Нёман, Заходняя Дзвіна, Заходні Буг, Волга, Вісла.

7. ***Разгадайце шарады.***

Тры літары – жыллё для нас, дзве – прыназоўнік азначаюць.
А ўрэшце – печ. У ёй якраз чыгун і выплаўляюць.

Нізкарослы конь, а злева той займеннік, што і справа –
І не стане неспадзевам дальняе дзяржавы.

Калі складзеш ты і прыстаўку, і летні загарадны дом,
То выйду я не на забаўку, - са мной не справішся хапком.

8. ***Да рускіх прыказак і прымавак дапішыце адпаведныя беларускія.***

Без труда не вытащишь и рыбку из пруда.
Грамоте учиться - всегда пригодится.
Моя хата с краю – ничего не знаю.
Любишь кататься – люби и саночки возить.

9. ***Складзіце і запішыце сказы, ужываючы дадзеныя словы спачатку ў прамым значэнні, а потым – у пераносным.***

Залаты, ляцець, кіпець, стаяць.

10. ***Выберыце тыя словы, якія маюць антонімы, і запішыце іх парамі.***

Неба, багацце, раніца, салодкі, вясёлы, сумны, кіслы, вечар, моцны, гарачы, слабы.

11. ***Складзіце некалькі сказаў на тэму "Прыход вясны". Выкарыстайце прыведзеныя і іншыя словы з супрацьлеглым значэннем.***

Дзень, раніцай, увечары, цяплець, халадаць, паўднёвы, паўночны, падмярзаць, падтайваць, ноч, лядок, вада, ясна, хмурны.

12. ***Запішыце прыметнікі і дзеясловы ў такім парадку, каб ступень праяўлення прыметы ці дзеяння ўзрастала.***

Балець, смылець, шчымець.

Адважны, бясстрашны, смелы.

Глядзець, паглядаць, цікаваць.

***13. Параўнайце словы і адкажыце: якое слова абазначае поўнае заспакаенне, а якое – частковае? Складзіце са словамі сказы.***

Прыціхла і анямела.

***14. Чаго не зразумела малодшая сястра? Напішыце.***

Старэйшая сястра пытаецца ў малодшай:

- Ты навошта ў маім сшытку малюеш?
- Чаму ў тваім? На ім жа напісана – "Агульны".

***15. Прачытайце верш і паспрабуйце вызначыць значэнні дзеяслова*** ісці.

Падарожнік ідзе
(Шмат дарог ён прайшоў),
І машына ідзе
З поўным кузавам дроў.
Самалёт жа ідзе

На ўзлёт ці пасадку.
Ну, а дожджык ідзе,
Каб паліць нашу градку.

***16. Прыдумайце і запішыце як мага больш словазлучэнняў або кароткіх сказаў са словам*** вострые, корань.

***17. Запішыце адказ. Чаму Коля не зразумеў свайго бацьку?***

- Калі ты, нарэшце, Коля, выправіш сваю двойку па матэматыцы? – запытаўся бацька ў сына.
- А як я магу выправіць, калі журнал знаходзіцца ў настаўніцы.

***18. Змяніце ў словазлучэннях галоўныя словы так, каб залежныя сталі ўжывацца ў пераносным значэнні.***

Залатыя завушніцы, стальныя рэйкі, кіслая капуста, зорная ноч, цвёрды камень, калючы вожык, ружовая сукенка.

***19. Замяніце ў сказах дзейнікі так, каб дзеясловы – выказнікі набылі пераносныя значэнні.***

Ходзіць карова. Спявае дзяўчынка. Гамоніць дзед. Спіць дачушка. Вые воўк. Маці адпачывае.

***20. Запішыце, чым адрозніваюцца ?***

Балтыйскае мора ад мора кветак?
Чыгуначны шлях ад баявога шляху?
Сонечны прамень ад сонечнага настрою?

***21. Растлумачце сэнс прыказкі.***

Як што рабіць – агонь, а як што зробіць – у агонь.

22. ***Замяніце ў сказах усе словы сінонімамі.***

Уважліва ўглядаецца ў цемру немалады шафёр.
Сцежка вывела турыстаў з бору на палетак.

***23. Падбярыце сінанімічныя назвы адценняў колеру да слоў***
аранжавы, блакітны, фіялетавы, жоўты, зялёны, чырвоны.

**24. *Падбярыце па 4 сінонімы да дзеясловаў*** біць, гаварыць, спалохацца, блішчаць.

**25. *Запішыце пятае "лішняе".***

Адвага, смеласць, мужнасць, напорыстасць, храбрасць.
Аснова, дарога, падстава, глеба, фундамент.
Ашукаць, падмануць, прадбачыць, перахітрыць, аблічыць.

**26. *Замяніце ў тэксце асобныя словы антонімамі так, каб увесь тэкст атрымаў супрацьлеглае значэнне.***

Восень… Птушкі адляцелі ў вырай. З кожным днём усё слабей і слабей свеціць сонца. Становіцца халадней. Дрэвы паволі скідваюць з сябе старыя лісцёвыя сукенкі. Часцей дзьме злосны паўночны вецер. Неба хмарнае. Хутка зіма.

**27. *Замяніце гэтыя пары слоў сінанімічнымі.***

Здагадлівы – нездагадлівы.
Смелы – баязлівы.
Улетку – узімку.
Таленавіты – бяздарны.

**28. *Замяніце дзеяслоў*** сказаць ***іншымі словамі – сінонімамі.***

- Добры дзень, Аня! – сказала цётка Ніна.
- Добры дзень! – сказала ёй Аня.
- Бацькі дома? – сказала цётка.
- Пайшлі на работу, – сказала дзяўчынка.
- А ты што робіш? – сказала жанчына.

## Адказы да раздзела "Лексіка"

## III узровень

1. 1)Б, 2)В, 3)В.
2. …хто праўду кажа.
   …адкажуць.
   …дзень ясны

3. Злосны – добры, баязлівы – смелы, мірны – ваенны, доўгі – кароткі, нізкі – высокі, цвёрды – мяккі.
4. Хадзіць – крочыць, шкандыбаць; рэшата – сіта; радасць – весялосць; працоўны – рабочы.
5. Сіло – пятля для лоўлі птушак і дробных жывёл; ганчар – чалавек, які робіць вырабы з гліны; амялушка – птушка; валун – вялікі камень; палонка – незамерзлы ўчастак ледзяной паверхні вадаёма.
6. Хлеб – прадукт харчавання; чарніцы – ягады; памідор – агародніна; аўтобус – пасажырскі від транспарту.
7. Глыбокія веды, залатое сэрца, калючы мароз.
8. 1 – у вожыка; 2 – у хваёвых дрэў; 3 – прылада для шыцця.
9. Авёс, саўгас.

10. Крыса – пацук, пачка – пачак, бровь – брыво, лицо – твар, лопата – рыдлёўка, диван – канапа, карандаш – аловак, луч – прамень, висок – скроня.

11. Лес - пушча , у бары, гай.

12. …мала; …высушыць; …свайго…; …аддаць.

13. Актыўны – пасіўны.
Уважлівы – няўважлівы.
Таленавіты – бяздарны.
Хлуслівы – праўдзівы.
Скупы – шчодры

14. Узяць кнігу, узяць курс на поўнач, узяць умацаванні, узяць у дужкі, узяць слова, узяць прыцэл, узяць на ўлік.

15. … тонкая; …спускаецца; … цёплым;… адгадка.

16. Васілёк, валошка.
Загад, каманда, распараджэнне.
Ліпкі, клейкі.

17. Салодкая – горкая. Налева – направа.

18. Вада, лес, вясна, цукар, гаспадыня, снег.

## IV узровень

1. Фасоля, памідор, рэпа, цыбуля.

2. … ўраджай;… ведаць будзеш; …не пакіне ў бядзе;.. і мае; … адзін раз адрэж.

3. Маляр фарбуе столь, сцены, падлогу.
Цясляр будуе дамы з драўніны, займаецца вырабам мэблі.
Бондар выробляе бочкі, дзежкі.
Машыніст водзіць паязды.
Муляр з цэглы будуе дамы.
**4.** Бабёр, ажыны, васілёк, прас.
**5**. Кропля, люстэрка, раніца, верасень, шпалеры, бэз, журавіны, трус, цукар, цукерка.
**6.** Рагоча, хутка, пазваць, халодны, завіруха, цягнік, дах, асілак, багна, ціхі, сціхнуць.
**7.** Салдацкая зорка, нябесная зорка, эстрадная зорка.
**8.** Вясёлы, цёплы, працавіты, брыдкі, слабы, ціхі.
**9**. Гасцінец, косы.
10. Веданне **замежных** моў адкрывае перад чалавекам шырокія перспектывы. Нашы рэкі і азёры славяцца **мноствам** рыбы. На горад павольна находзіла **цёмная** ноч. Хлопчыка апанаваў **сумны** настрой.
11. Пачуццё, чурбан, чалавек.
12. Патушыць свечку, патушыць пажар, <u>патушыць спрэчку</u>.
Маўклівы чалавек, <u>маўклівы лес</u>, маўклівае дзіця.
Празрыстае шкло, празрыстае воблака, <u>празрысты погляд.</u>
13. У музеі сабраны старадаўнія рэчы. Ля дарогі стаяла старая бяроза. Мне трэба вырваць зуб. Лодку выцягнулі з вады.
14. Прыціхла, анямела. Халодная, сцюдзёная. Нешта б прыдумала, нешта б змаргеліла.
15. а) Увосень, калі ў лесе жаўцее лісце, мне рабілася **весела** ад таго, што сонца як быццам **мацнела**, рабілася **дужым**. **Лёгка** быць у полі са статкам у **сонечны** дзень.
б) Надышло **халоднае** лета. **Халодны** ветрык **прыганяў** хмары, і яны **густа** ўкрывалі неба. У поўдзень сонца плыло па небе **нізка** і пасылала **халодныя** прамяні.
16. А там ячмень тапырыць свае калючыя вусы.
Беглі дні, і памалу канчалася восень.
17. -\\-
18. Малады. Новы. Забруджанае. Чэрствы.

19. Дзень, радасць, холад, вечар, здароўе, старасць, усход, мір, багач, весялосць.
20. Новых сяброў набывай, а старых не забывай. Гультай за работу – мазоль за руку. Дзе няма ведаў, там не будзе смеласці. Прыгожая птушка пер'ем, а чалавек – уменнем. Чалавек без Радзімы як салавей без песні. Горкая часам праца, ды хлеб ад яе салодкі. Хто чужога не шануе, той свайго не мае. Ідзі ў родны край – там і пад елкай рай. Не той шмат ведае, хто доўга жыў, а той, хто шмат вучыўся.
21. -\\-

## V узровень

1. а) абрус, б) парасон, в) вясёлка, г) юшка, д) экспанат.
2. Весна пришла как-то неожиданно. Солнце поднялось над лесом. Оно широко раскрыло глаза. Сразу с холмов побежали ручейки. На реке начался ледоход. На склонах берегов показались чёрные пятна. Земля вздохнула после долгого сна.
3. Велічны, бліскавіца, убачыць, валачыць, бегчы.
4. Луста – адрэзаны плоскі кусок хлеба.
   Жальба – сум, крыўда, смутак, шкадаванне.
   Лучына – тонкія, сухія, звычайна доўгія сасновыя шчэпкі, запальваючы якія, раней асвятлялі хаты.
   Кірмаш – святочны базар.
   Калектыў – група людзей, аб'яднаных агульнай працай.
   Шклянка – шкляная пасудзіна цыліндрычнай формы.
   Хустка – галаўны ўбор.
5. Вечарам у лесе

   Цёмныя цені ляжаць пад дрэвамі. Нерухома стаяць старыя сосны, чарнеюць густыя яліны. Пахне ў лесе смалой, сасновай хвояй, асенняй апалай лістотай. Схавалася за верхалінамі вячэрняе нізкае сонца. Яшчэ не спяць жыхары лесу. Вось на ствале дрэва ўсеўся чорны дзяцел, пачаў дзяўбці дрэва. Вакол яго круцяцца спрытныя сінічкі, падбіраюць жучкоў і чарвячкоў. Хутка наступіць чорная ноч. Змоўкнуць і заснуць дзённыя птушкі і звяры.

6. Самыя значныя рэкі Беларусі – Днепр, Нёман, Заходняя Дзвіна.
7. Домна, Японія, задача.
8. Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца.
   Навуку за плячыма не носяць.
   Я не я, і хата не мая.
   Любіш ездзіць на вазочку з гары, любі ж і вазочак вазіць на гару.
9. -\\-
10. Раніца- вечар, салодкі - кіслы, вясёлы- сумны, моцны - слабы.
11. -\\-
12. Смылець, шчымець, балець.
    Смелы, адважны, бясстрашны.
    Цікаваць, паглядаць, глядзець.
13. -\\-
14. Слова *агульны* мнагазначнае. Малая ўспрымае яго ў значэнні "калектыўны, які належыць усім". Тут жа слова *агульны* выступае ў значэнні "які не мае спецыяльнага прызначэння".
15. Падарожнік крочыць, машына едзе, самалёт ляціць, дождж капае.
16. Корань дрэва, корань зуба, корань зла, корань слова.

Востры нож, востры твар, вострая трывога, востры розум, востры позірк, вострае слова, вострая прыправа, востры пах, востры боль, вострая сітуацыя.

17. Слова *выправіць* мнагазначнае. Бацька ўжыў яго ў значэнні "ліквідаваць пропуск у ведах". Коля ж успрыняў гэта як слова ў значэнні "унесці папраўку ў журнал".
18. Залатыя рукі, стальныя нервы, кіслы твар, зорная хвароба, цвёрды характар, калючае слова, ружовая надзея.
19. Ходзіць думка. Спявае сэрца. Гамоніць гай. Спіць лес. Вые вецер. Поле адпачывае.
20. Балтыйскае мора - частка акіяна; мора кветак - вялікая колькасць.

Чыгуначны шлях – дарога, прыстасаваная для руху транспарту; баявы шлях - учынкі і здзяйсненні каго – небудзь.
Сонечны прамень – прамень сонца; сонечны настрой - радасны, шчаслівы настрой.

21. Тое, што чалавек робіць хутка, атрымліваецца няякасным і таму заслугоўвае знішчэння.
22. Пільна ўзіраецца ў цемень пажылы вадзіцель.
Сцяжынка прывяла падарожнікаў з лесу на поле.
23. -\\-
24. Біць – стукаць, ударацъ, лупцаваць, лупіць; гаварыць – казаць, гаманіць, гутарыць, бубнець; спалохацца – збаяцца, спудзіцца, жахнуцца, знямець; блішчаць – ззяць, зіхацець, ірдзець, ярчэць.
25. Напорыстасць, дарога, прадбачыць.
26. Вясна… Птушкі прыляцелі з выраю. З кожным днём усё мацней і мацней грэе сонца. Становіцца цяплей. Дрэвы паволі накідваюць на сябе новыя лісцёвыя сукенкі. Часцей дзьме ласкавы паўднёвы вецер. Неба чыстае. Хутка лета.
27. Кемлівы – някемлівы. Храбры – палахлівы. Летам – зімой. Здольны – няздольны.
28. Прывіталася, адказала, спыталася, паведаміла, пацікавілася.

## IV. Марфалогія

У лесе родную вучыў я мову.
Назоўнікамі дрэвы ў іх звіняць.
Тут птушкі ўтвараюць дзеясловы –
**Пяюць, шчабечуць, свішчуць і крычаць.**
Прыметнікамі бор здалёк прыкметны –
**Зеленачубы,**
**статны,**
**залаты.**
Сустрэне бор займеннікам прыветным:
Як з лепшым сябрам,
з кожным **ён** на **ты**…
*Віктар Гардзей*

## Назоўнік

### III узровень

1. ***Падкрэсліце ў сказе назоўнікі.***

Травы пахнуць кветкамі, кветкі пахнуць зорамі,
зоры над палеткамі – лесам і азёрамі. (П. Глебка)

2. ***Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце назоўнікі, ужытыя ў пачатковай форме.***

З..зюля – шэрая і н..прыкметная птушка. Яна не ладзіць свайго гн..зда. У к..нцы в..сны вернецца з д..лёкага выраю і ўсё лётае на перал..сках. Яе песня – кукаван..е. (У. Ягоўдзік )

3. ***Складзіце са слоў сказы. Вызначце склон усіх назоўнікаў.***

Летнім, па, лясной, (сцяжынка), ішоў, днём, дзядуля. Сеў, каля, яра, ён, адпачыць. (Стаяць), гарачыня. Вельмі, піць, (хацець). Спусціўся, на, дно, дзядуля, яра.

4. ***Да дадзеных слоў падбярыце аднакарэнныя назоўнікі, вызначце іх род.***

Хатні, ціхі , марскі, ценявы, гусіная.

5. ***Запішыце словазлучэнні, паставіўшы словы, што ў дужках, у патрэбнай па сэнсе форме. Вызначце склон назоўнікаў.***

Сустрэўся з (Міша), дзякаваць (настаўніца), смяяцца з (сябар), паштоўка (Грыша), лісце ( клён), ляжала на (падлога), ганаруся (Беларусь).

6. ***Запішыце назоўнікі ў творным склоне. Абазначце канчаткі.***

Радасць, прыстань, веліч, мужнасць, ноч, гладзь, край, бег, гай, соль, свежасць.

7. ***Назоўнікі, што ў дужках, пастаўце ў патрэбным склоне. Спішыце.***

На (вуліца) чуліся звонкія галасы і смех.
Па (дарога) ніхто не едзе і не ідзе.
(Кошка) смех, а (мышка) смерць.
Прыемна шамаціць вецер па (страха).
Вада ў (рака) разлілася шырока.

8. ***Разбярыце сказ па членах сказа. Пастаўце знакі прыпынку. Вызначце склон назоўнікаў.***
Хутка прыйшла сумная восень і журавы паляцелі ў цёплыя краіны.

**IV узровень**

1. ***Пастаўце назоўнікі ў множным ліку.***
Апенька, неба, калена, камень, торт, чорт, вугал, курыца, бервяно, племя, армянін, дзяўчына.

2. ***Спачатку запішыце назоўнікі, якія ўжываюцца ў адзіночным і множным ліку, потым – толькі ў адзіночным ліку, затым назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку.***
Гульні, вермішэль, нажніцы, арэлі, дрыжыкі, палосы, сум, адзнакі, дзверы, дровы, гай, чысціня, святло.

3. ***Дапішыце канчаткі ў словах.***
Сынок, уставай, маленьк.. лежабока. Міша быў сведк.. нашай размовы, а Вера сведк.. не была. Пецька – вялік.. скнара, Танька – поўн.. тупіца. Колька – страшэнн.. абжора, Інка – вечн.. плакса.

4. ***Перакладзіце на беларускую мову. Вызначце род назоўнікаў.***
Очки, вилка, отличник, фонарь, мечта, карман, учитель, гвоздь.

5. ***Запішыце словазлучэнні, словы ў дужках пастаўце ў патрэбнай форме, вызначце склон назоўнікаў.***
Разьба па (дрэва), паехаць у (млын), належыць (брат), сустрэцца на (мост), надвор’е з (усход), паляваць на

(мядзведзь), верабей на (страха), стаяць ля (дошка), падыходзіць да (вёска), купацца ў (рэчка), паставіць вазон на (падлога), далі кнігу (дзяўчынка).

6. ***Назоўнікі*** *вярба***,** *мяжа***,** *зямля***,** *нага***,** *рука***,** *страха* ***запішыце спачатку ў давальным склоне, затым – у месным.***

7. ***Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце скланенне назоўнікаў.***
Ябл..к, цішын.., руч..й, кло..н, гарш..ок, бал..рына, ..мокаць, дэл..гацыя, ка..ідор, л..генда, па..таль..н.

8. ***Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.***
Сугроб снега, в конце мая, капли дождя, килограмм гороха, кричу от боли, начало стихотворения, будильник соседа, порыв ветра.

9. ***Пастаўце назоўнікі ў месным склоне.***
Муха, шчака, дуга, краіна.

10. ***Перакладзіце на беларускую мову назоўнікі. Вызначце іх род.***
Зоология, биолог, стадион, трио, радио, пьеса, океан, телефон.

11. ***Выпішыце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку:*** канікулы, падзяка, шчасце, замаразкі, вячоркі, вучні, далонь, гарады.

12. ***Выпішыце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку:***
ляљка, пяшчота, цукар, студэнцтва, маланка, абрус, Беларусь, сарока, свежасць.

## V узровень

1. ***Вызначце род назоўнікаў.***

   Ірыс, кава, бэз, боль, вермішэль, гусь, жаль, зала, рысь, шынель, цень, канферансье, канфеці, купэ, меню, шымпанзэ, лебедзь, крышталь, мазоль, мель, палын, печань, жырафа.

2. ***Запішыце 10 назоўнікаў, якія не скланяюцца.***

3. ***Якія з прыведзеных назоўнікаў можна ўжываць як у множным, так і ў адзіночным ліку?***

   Дзверы, вароты, двайняты, грошы, акуляры, прысмакі.

4. ***Запішыце назоўнікі ў наступным парадку:***

   ***1)назвы прадметаў;***

   ***2)назвы прымет прадметаў;***

   ***3)назвы дзеянняў;***

   ***4) назвы лічбаў.***

   Зеляніна, сякера, аловак, гальштук, сямёрка, хадзьба, касьба, сінява, гарачыня, верашчака, пяцёрка, сінька, плывец, мітусня, чараўніца, бег, узрост, кемлівасць, цемрадзь.

5. ***Спішыце, раскрываючы дужкі і ўтвараючы словазлучэнні.***

   Паласа (лес), белы ад (іней), вядро (цэмент), жадаць (поспех), нахіліцца ад (вецер), зайсці да (брат), чакаць (вучань), рыхтавацца да (бой).

6. ***Пастаўце у множны лік словы*** *конік, трава, краска, лаза* ***і запішыце ў патрэбным месцы, каб атрымаўся верш Якуба Коласа. Вызначце склоны ўстаўленых назоўнікаў.***

   Ветрык … чуць калыша,  
   … шалясцяць,  
   Луг зялёны жыццём дыша—  
   … трашчаць.  
   У … шчэбет не сціхае,  
   Шум стаіць і свіст,  
   У яркім бляску спачывае

На ракіце ліст.

7. ***Як прынята называць дзяцей жывёл?***

У каровы – …, у сабакі – …, у авечкі – …, у казы – …, у курыцы – …, у марскога коціка – …, у насарога – …, у мышы – …, у вярблюда – …, у змяі-… .

8. ***Са слоў пабудуйце сказы, ужываючы назоўнікі 3-га скланення ў творным склоне. Запішыце.***

Прамені, расінка, у, ззяць, сонца, медзь, кожная.
Чайкі, над, насіцца, гладзь, вада, люстраная.
Балота, ад, прахаладзь, і, цягнуць, сырасць.
Лес, твар, у, свежасць, дыхнуць, спакой, урачысты, і.

9. ***Перакладзіце на беларускую мову назоўнікі і падкрэсліце тыя, якія ў беларускай мове маюць форму толькі множнага ліку.***

Очки, крупа, лента, прятки, дверь, грудь, мел, тряпка, скатерть, черника, бусы, брусника.

## Адказы да раздзела "Назоўнік"

### III узровень

1. <u>Травы</u> пахнуць <u>кветкамі</u>, <u>кветкі</u> пахнуць <u>зорамі</u>, <u>зоры</u> над <u>палеткамі</u> – <u>лесам</u> і <u>азёрамі</u>. (П. Глебка)
2. <u>Зязюля</u> – шэрая і непрыкметная <u>птушка</u>. Яна не ладзіць свайго гнязда. У канцы вясны вернецца з далёкага выраю і ўсё лётае на пералесках. Яе <u>песня</u> – <u>кукаванне</u>.
(У. Ягоўдзік)
3. Летнім днём (Т. скл.) па лясной сцяжынцы (М. скл.) ішоў дзядуля (Н. скл.). Каля яра (Р. скл.) сеў ён адпачыць. Стаяла гарачыня (Н. скл.). Вельмі хацелася піць. Спусціўся дзядуля (Н. скл.) на дно (В. скл.) яра (Р. скл.).

4. Хатні – хата (ж. р.).
   Ціхі – ціш (ж. р.).
   Марскі – мора (н. р.).
   Ценявы – цень (м. р.).
   Гусіная – гусь (ж. р.).
5. Сустрэўся з Мішам (Т. скл.), дзякаваць настаўніцы (Д. скл.), смяяцца з сябра (Р. скл.), паштоўка Грышу (Д. скл.), лісце клёна (Р. скл.), ляжала на падлозе (М. скл.), ганаруся Беларуссю (Т. скл.).
6. Радасцю, прыстанню, веліччу, мужнасцю, ноччу, гладдзю, краем, бегам, гаем, соллю, свежасцю.
7. На вуліцы (М. скл.) чуліся звонкія галасы і смех.
   Па дарозе (М. скл.) ніхто не едзе і не ідзе.
   Кошцы (Д. скл.) смех, а мышцы (Д. скл.) смерць.
   Прыемна шамаціць вецер па страсе (М. скл.).
   Вада ў рацэ (М. скл.) разлілася шырока.
8. Хутка прыйшла сумная восень (Н. скл.), і журавы (Н. скл.) паляцелі ў цёплыя краіны (В. скл.).

## IV узровень

1. Апенькі, нябёсы, калені, камяні, тарты, чэрці, вуглы, куры, бярвенні, плямёны, армяне, дзяўчаты.
2. Гульні, палосы, адзнакі, гай.
   Вермішэль, сум, чысціня, святло.
   Нажніцы, арэлі, дрыжыкі, дзверы, дровы.
3. Сынок, уставай, маленькі лежабока. Міша быў сведкам нашай размовы, а Вера сведкай не была. Пецька – вялікі скнара, Танька – поўная тупіца. Колька – страшэнны абжора, Інка – вечная плакса.
4. Акуляры (мн. л.), відэлец (м. р.), выдатнік (м. р.), ліхтар (м. р.), мара (ж. р.), кішэня (ж. р.), настаўнік (м. р.), цвік (м. р.).
5. Разьба па дрэве (М. скл.), паехаць у млын (В. скл.), належыць брату (Д. скл.), сустрэцца на мосце (М. скл.), надвор’е з усходу (Р. скл.), паляваць на мядзведзя (В. скл.), верабей на страсе (М. скл.), стаяць каля дошкі (Р.

скл.), падыходзіць да вёскі (Р. скл.), купацца ў рэчцы (М. скл.), паставіць вазон на падлогу (В. скл.), далі кнігу дзяўчынцы (Д. скл.).

**6.** Вярбе, мяжы, зямлі, назе, руцэ, страсе.
На вярбе, на мяжы, на зямлі, на назе, на руцэ, на страсе.

**7.** Яблык (2 скл.), цішыня (1 скл.), ручай (2 скл.), клоўн (2 скл.), гаршчок (2 скл.), балерына (1 скл.), цмокаць (дзеясл.), дэлегацыя (1 скл.), калідор (2 скл.), легенда (1 скл.), паштальён (2 скл.).

**8.** Гурба снегу, у канцы мая, кроплі дажджу, кілаграм гароху, крычу ад болю, пачатак верша, будзільнік суседа, парыў ветру.

**9.** Аб мусе, на шчацэ, па дузе, аб краіне.

**10.** Зоология – заалогія (ж.р.), биолог – біёлаг (м.р.), стадион – стадыён (м.р.), трио – трыа (н.р.), радио – радыё (н.р.), пьеса – п'еса (ж.р.), океан – акіян (м.р.), телефон – тэлефон (м.р.).

11. Канікулы, замаразкі, вячоркі.

**12.** Пяшчота, цукар, студэнцтва, Беларусь, свежасць.

## V узровень

**1.** Ірыс (м. р.), кава (ж. р.), бэз (м. р.), боль (м. р.), вермішэль (ж. р.), гусь (ж. р.), жаль (м. р.), зала (ж. р.), рысь (ж. р.), шынель (м. р.), цень (м. р.), канферансье (м. р.), канфеці (н. р.), купэ (н. р.), меню (н. р.), шымпанзэ (м. р.), лебедзь (м. р.), крышталь (м. р.), мазоль (м. р.), мель ( ж. р.), палын (м. р.), печань (ж. р.), жырафа (ж. р.).

**2.** Журы, меню, метро, паліто, фае, таксі, кафэ, дэпо, кіно, радыё.

**3.** Дадзеныя назоўнікі маюць форму толькі множнага ліку.

**4.** 1) сякера, аловак, гальштук, верашчака, сінька
2) зеляніна, сінява, гарачыня, цемрадзь, кемлівасць, чараўніца, узрост
3) хадзьба, касьба, плывец, бег, мітусня
4) сямёрка, пяцёрка

5. Паласа лесу, белы ад інею, вядро цэменту, жадаць поспеху, нахіліцца ад ветру, зайсці да брата, чакаць вучня, рыхтавацца да бою.
6. Ветрык **краскі** (В. скл.) чуць калыша,
   **Травы** (Н. скл.) шалясцяць,
   Луг зялёны жыццём дыша –
   **Конікі** (Н. скл.) трашчаць.
   **У лозах** (М. скл.) шчэбет не сціхае,
   Шум стаіць і свіст,
   У яркім бляску спачывае
   На ракіце ліст.
7. У каровы – цяля, у сабакі – шчаня, у авечкі – ягня, у казы – казляня, у курыцы – кураня, у марскога коціка – кацяня, у насарога – парася, у мышы – мышаня, у вярблюда – верблюдзяня, у змяі – змеяня.
8. У праменях сонца кожная расінка ззяе меддзю.
   Чайкі носяцца над люстраной гладдзю вады.
   Ад балота цягне прахаладдзю і сырасцю.
   Лес дыхнуў у твар урачыстым спакоем і свежасцю.
9. Очки – акуляры, крупа – крупы, лента – стужка, прятки – хованкі, дверь – дзверы, грудь – грудзі, мел – крэйда, тряпка – ануча, скатерть – абрус, черника – чарніцы, бусы – пацеркі, брусника – брусніцы.

## Прыметнік

### ІІІ узровень

1. ***Да назоўнікаў падбярыце прыметнікі, якія падыходзяць па сэнсе.***

   Возера – …, кніга – …, яблык – ….

2. ***Утварыце ад дадзеных назоўнікаў аднакаранёвыя прыметнікі.***

   Дрэва – … , вясна – … , сасна – … , бяроза – …, лета – .. .

3. ***Утварыце словазлучэнні. Абазначце канчаткі прыметнікаў.***

Надвор'е, паліто, вада (халодны);
Яблык, цукерка, пірог (смачны);
Выпадак, знаходка, здарэнне (цікавы).

4. ***Да прыметнікаў*** *высокі, халодны, шырокі, цвёрды, вясёлы, мокры, чэрствы* ***падбярыце назоўнікі, якія падыходзяць па сэнсе, і запішыце атрыманыя словазлучэнні.***

5. ***Якія з наступных слоў з'яўляюцца прыметнікамі?***
Белы, бяліць, беленькі, белаваты, белізна, белавежскі.

## IV узровень

1. ***Вызначце род назоўнікаў і дапішыце канчаткі прыметнікаў.***
Беларуск.. жывапіс, вугальн.. пыл, шырок.. далонь, калмат.. сабака, гумав.. галёш, сучасн.. моладзь, высок.. таполя, балюч.. мазоль, калгасн.. шафёр, мал.. дзіця, цудоўн.. настрой, бліскуч.. крышталь, вялік.. зала, каротк.. запіс.

2. ***З дадзенымі словазлучэннямі прыдумайце і запішыце сказы.***
Мяккі снег, мяккае сэрца, мяккі чалавек, мяккая тканіна.

3. ***Вызначце род, лік і склон прыметнікаў.***
Нечакана высунулася вялізная галава з разгалістымі рагамі.
Гэта была невялічкая светлая палянка сярод лесу.

4. ***Да дадзеных назоўнікаў падбярыце адзін з двух прыметнікаў. Запішыце словазлучэнні.***
Сукенка: шаўковая, шаўкавістая.
Мясцовасць: лясная, лясістая.

Чалавек: пісьмовы, пісьменны.

## V узровень

1. ***Пераўтварыце словазлучэнні "назоўнік + назоўнік" у словазлучэнні "прыметнік + назоўнік".***
   Дзённік Пеці, хатка бабра, сшытак Машы, касцюм дзядулі, гняздо ластаўкі.

2. ***Перакладзіце на беларускую мову, вызначце род назоўнікаў.***
   Белый гусь, красное яблоко, охотничья собака, серая шинель, золотая медаль, высокий тополь.

3. ***Дапішыце супрацьлеглыя па значэнні прыметнікі. Устаўце прапушчаныя канчаткі.***
   Добр.. слава людзей збірае, а …  разганяе.
   Праўда халодн.. , а мана … .
   Парожн.. бочка звініць, а … маўчыць.
   З вялік.. грому … дождж бывае.

4. ***Размясці прыметнікі ў парадку узмацнення прыкметы***.
   Багаты, заможны, бязбедны.
   Збялелы, бледны, бяскроўны.

## Адказы да раздзела "Прыметнік"

## III узровень

**1.** Возера – блакітнае, глыбокае, празрыстае.
Кніга – цікавая, разгорнутая, займальная.
Яблык – духмяны, смачны, зялёны.

**2.** Дрэва – драўляны; вясна – вясновы, вясенні, веснавы; сасна – сасновы; бяроза – бярозавы; лета – летні.

**3.** Халодн<u>ае</u> надвор'е, халодн<u>ае</u> паліто, халодн<u>ая</u> вада.

Смачны яблык, смачная цукерка, смачны пірог.
Цікавы выпадак, цікавая знаходка, цікавае здарэнне.

4. Высокі чалавек, халодны дзень, шырокі абрус, цвёрды характар, вясёлы канцэрт, мокры куст, чэрствы хлеб.
5. Белы, беленькі, белаваты, белавежскі.

### IV узровень

1. Беларускі жывапіс (м. р.), вугальны пыл (м. р.), шырокая далонь (ж. р.), калматы сабака (м. р.), гумавы галёш (м. р.), сучасная моладзь (ж. р.), высокая таполя (ж. р.), балючы мазоль (м. р.), калгасны шафёр (м. р.), малое дзіця (н. р.), цудоўны настрой (м. р.), бліскучы крышталь (м. р.), вялікая зала (ж. р.), кароткі запіс (м. р.).
2. У снежні выпаў мяккі пушысты снег. У маёй маці мяккае далікатнае сэрца. Мяккі чалавек заўсёды дорыць сваю цеплыню. Гарнітур Дзеда Мароза сшылі з мяккай чырвонай тканіны.
3. Вялізная (галава) – ж.р., адз.л., Н.скл.; з разгалістымі (рагамі) – мн.л., Т.скл.; невялічкая, светлая (палянка) – адз.л., ж.р., Н.скл. .
4. Шаўковая сукенка, лясістая мясцовасць, пісьменны чалавек.

### V узровень

1. Пецеў дзённік, бабровая хатка, Машын сшытак, дзядулеў касцюм, ластаўчына гняздо.
2. Белая гусь – ж.р., чырвоны яблык – м.р., паляўнічы сабака – м.р., шэры шынель – м.р., залаты медаль – м.р., высокая таполя – ж.р. .
3. Добрая слава людзей збірае, а дрэнная разганяе.
   Праўда халодная, а мана цёплая.
   Парожная бочка звініць, а пустая маўчыць.
   З вялікага грому малы дождж бывае.
4. Бязбедны, заможны, багаты.
   Бледны, збялелы, бяскроўны.

## Дзеяслоў. Займеннік. Прыслоўе

### III узровень

1. ***Выпішыце дзеясловы ўжытыя ў неазначальнай форме.***
   Несці, купіў, напішу, гуляе, пабегчы, пытаць.

2. ***Ад дадзеных слоў утварыце дзеясловы ў неазначальнай форме.***
   Шыю – …, белы – …, нёс – …, пішу – …, чорны – …, бег – .. .

3. ***Устаў літары*** *с* ***ці*** *з* ***у словах, абазнач скланенне назоўнікаў і час дзеясловаў.***
   Ра..казалі, гру.., ра..мова, ра..губіўся, ма..ь, ра..шпіляе, ра..чынім, ра..гневаецца, ра..воддзе.

4. ***Замяніце, дзе трэба, назоўнікі займеннікамі. Пазначце склон, асобу, лік займеннікаў.***
   Грыша добра вучыўся. Грыша любіў чытаць цікавыя кнігі. З Грышам прыемна было гутарыць. Да Грышы часта прыходзілі сябры.

5. ***Якія з наступных слоў прыслоўі?***
   Шумна, зверху, нізка, моцны, хутка, высокі.

### IV узровень

1. ***Ад наступных назоўнікаў утварыце дзеясловы неазначальнай формы.***
   Збор –…, гаворка –…, дапамога –…, адказ –…, неспакой –…, парада –…, прыпынак –…, касьба –… .

2. ***Ад назоўнікаў*** *сябар, вячэра* ***і прыметнікаў*** *сухі, чырвоны* ***ўтварыце дзеясловы і пастаўце іх у цяперашнім, прошлым і будучым часе.***

3. ***Ад дадзеных назоўнікаў утварыце роднасныя словы (прыметнік, дзеяслоў, прыслоўе).***
   Сум, дружба, радасць, шум.

4. ***Змяніце займеннікі, як патрабуе сэнс.***
   Прыйшоў да (ты), сустрэўся са (я), гаварыў з (ён), пайшлі з (мы).

5. ***З дадзеных слоў складзіце сказы, выкарыстоўваючы дзеясловы ў прошлым часе.***
   Сонца, спускаецца, лес, за.
   Ад, доўгія, будынкаў, дрэў, і, цені, пралягаюць.
   Ракой, туман, над, узнімаецца.

6. ***Пастаўце дзеясловы ў форме 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу.***
   Паўтарыць, гаманіць, гаварыць, спісаць.

## V узровень

*1.* **Адным дзеясловам замяніце наступныя словазлучэнні.**

Знаходзіцца ў неспакойным стане; зрабіць няправільна; напружана слухаць нешта слаба чутнае; весці барацьбу; пасылаць лісты і атрымліваць іх; кідаць мяч другому і лавіць кінуты ім мяч.

2. ***Дапішыце кожную прыказку. Абазначце час дзеясловаў.***
   За двума зайцамі пагонішся – ніводнага … .
   Работа нікога … .
   Ваўкоў баяцца – у лес … .
   Пад ляжачы камень вада … .

3. ***Спішыце , устаўце прапушчаныя дзеясловы. Падкрэсліце прыназоўнікі.***

Пад ялінай … баравік. … яго вавёрка. Сарвала грыбок, … хвосцікам і хуценька … на дрэва.

4. ***Да слоў падбярыце прыслоўі – антонімы.***
Зверху – … , весела – … , справа – … , заўтра - … .

5. ***Знайдзіце месца дзеясловаў*** *бушаваў, дзьмуў, злаваў, зрываў* ***у вершы Э. Агняцвет.***
… паўночны змрочны вецер
І на ўсіх … на свеце.
На дарогах …,
Нават дахі ён … .

6. ***Выпішыце дзеясловы, вызначце іх асобу, час, лік.***
Пра беларускую вёску Хатынь ведае ўвесь свет. А зараз замест вёскі з хатамі стаяць чорныя коміны.

7. ***Кожнае спалучэнне слоў замяніце адпаведным па сэнсе дзеясловам.***
Язык праглынуць, даймаць просьбамі, дрыжаць як асінавы ліст.

8. ***Устаўце замест кропак займеннікі і прыназоўнікі. Спішыце. Вызначце асобу, лік, склон займеннікаў.***
Бабёр вельмі цікавы звярок. Па зямлі … рухаецца даволі нязграбна. Заднія ногі … значна даўжэйшыя за пярэднія. Бегчы … цяжка. Затое ў вадзе … … не ўгнацца. Хвост бабра, як у рыбы. А … заднія лапы маюць перапонкі, як у качкі.

9. ***Укажыце, якімі часцінамі мовы могуць быць наступныя словы. Складзіце з імі словазлучэнні.***
Палі, сталі.

**Адказы два раздзела “Дзеяслоў. Займеннік. Прыслоўе”**

### III узровень

1. Несці, пабегчы, пытаць.
2. Шыю – шыць, белы – бялець, нёс – несці, пішу – пісаць, чорны – чарнець, бег – бегчы.
3. Ра**с**казалі (пр. ч.), гру**з** (2 скл.), ра**з**мова (1 скл.), ра**з**губіўся (пр. ч.), ма**з**ь (3 скл.), ра**с**шпіляе (цяп. ч.), ра**с**чынім (буд. ч.), ра**з**гневаецца (буд. ч.), ра**з**воддзе (2 скл.).
4. Грыша добра вучыўся. Ён (Н.скл., 3-я ас., адз.л.) любіў чытаць цікавыя кнігі. З Грышам прыемна было гутарыць. Да яго (Р.скл., 3-я ас., адз.л.) часта прыходзілі сябры.
5. Шумна, зверху, нізка, хутка.

### IV узровень

1. Збор – збіраць, гаворка – гаварыць, дапамога – дапамагаць, адказ – адказаць, неспакой – непакоіцца, парада – параіць, прыпынак – прыпыніцца, касьба – касіць.
2. Сябар – сябруюць, сябравалі, пасябруюць (будуць сябраваць).
   Вячэра – вячэраюць, вячэралі, павячэраюць (будуць вячэраць).
   Сухі – сушу, сушылі, высушаць (будуць сушыць).
   Чырвоны – чырванее, чырванеў, пачырванеюць (будуць чырванець).
3. Сум – сумны, сумаваць, сумна.
   Дружба – дружны, дружыць, дружна.
   Радасць – радасны, радавацца, радасна.
   Шум – шумлівы, шумець, шумна.
4. Прыйшоў да цябе, сустрэўся са мною, гаварыў з ім, пайшлі з намі.
5. Сонца спусцілася за лес. Ад будынкаў і дрэў праляглі доўгія цені. Над ракой узняўся туман.
6. Паўтарыць – паўтарае, гаманіць – гамоніць, гаварыць – гаворыць, спісаць – спісвае.

## V узровень

1. Знаходзіцца ў неспакойным стане – хваляваацца.
   Зрабіць няправільна – памыліцца.
   Напружана слухаць нешта слаба чутнае – прыслухоўвацца.
   Весці барацьбу – змагацца.
   Пасылаць лісты і атрымліваць іх – перапісвацца.
   Кідаць мяч другому і лавіць кінуты ім мяч – перакідвацца.
2. За двума зайцамі пагонішся (буд.ч.) – ніводнага не зловіш (буд.ч.).
   Работа нікога не ганьбіць (цяп.ч.).
   Ваўкоў баяцца (неазн.ф.) – у лес не хадзіць (неазн.ф.) .
   Пад ляжачы камень вада не цячэ (цяп.ч.).
3. <u>Пад</u> ялінай **рос** баравік. **Убачыла** яго вавёрка. Сарвала грыбок, **вільнула** хвосцікам і хуценька **ўскочыла** <u>на</u> дрэва.
4. Знізу, сумна, злева, сёння.
5. Дзьмуў паўночны змрочны вецер
   І на ўсіх злаваў на свеце.
   На дарогах бушаваў,
   Нават дахі ён зрываў. (Э Агняцвет)
6. Ведае – 3-я ас., цяп.ч., адз.л..
   Стаяць – 3-я ас., цяп.ч., мн.л..
7. Язык праглынуць – замаўчаць, даймаць просьбамі – надакучаць, дрыжаць як асінавы ліст – баяцца.
8. Бабёр вельмі цікавы звярок. Па зямлі ён (3-я ас., адз.л., Н. скл.) рухаецца даволі нязграбна. Заднія ногі яго (3-я ас., адз. л., Р. скл.) значна даўжэйшыя за пярэднія. Бегчы яму (3-я ас., адз. л., Д. скл.) цяжка. Затое ў вадзе за ім (3-я ас., адз. л., Т. скл.) не ўгнацца. Хвост бабра, як у рыбы. А яго (3-я ас., адз. л., Р. скл.) заднія лапы маюць перапонкі, як у качкі.
9. Палі – назоўнік. Калгасныя палі.
   Палі – дзеяслоў. Палі з пушкі.

Палі – дзеяслоў. Палі градку.
Сталі – назоўнік. Адліваюць са сталі.
Сталі – дзеяслоў. Сталі на дарозе.

## V. Арфаграфія

Слова наша роднае, хапала
На стагоддзі доўгія цябе.
Багдановіч, Колас і Купала
Прыпадалі да цябе ў журбе…
*Г. Бураўкін*

### III узровень

***1. Устаўце замест кропак у або ў.***

Цыр..льня адкрываецца,
Х..тчэй, х..тчэй бяжы!
З..бро.., мядзведзя.., зайца.. –
Усіх стрыг..ць стрыжы.

***2. Устаўце прапушчаныя літары.***

Галу..ка, сту..ка, кні..ка, бяро..ка, вучы..ся, ка..ба, кры..ка, про..ка, скла.., м..лодыя, дал..чыня, п..рон, ц..гавіты, П..трусь, по..зд, сн..гавік, г..рбарый, майст..р, шніц..ль, прыв..зь, бухгалт..р, сн..гір.

***3. Змяніце словы або ўтварыце новыя так, каб о, э перайшлі ў а. Запішыце.***

Корань, голас, розум, звон, шоўк, колас, гоман, шэрсць.

***4. Змяніце словы або падбярыце аднакаранёвыя, каб у іх***

***адбылося падаўжэнне зычных.***
Колас, печ, суд, высь, багаты, сук, жыць.

5. ***Змяніце словы так, каб замест е, ё трэба было пісаць літару я.***
Мёд, клён, цвёрды, дзень, след, лес, пень, сцены.

***6. Дакажыце на пісьме, чаму так пішуцца гэтыя словы.***
Агарод – …, слуп – ..., бераг – …, смех – …, абруч – …, нож – …, казка – …, дубкі – … .

***7. Устаўце (дзе трэба) раздзяляльны мяккі знак або апостраф.***
Рэл..еф, л..е, сям..я, п..еса, ад..езд, павіл..ён, здароў..е, міл..ён, Юл..ян, пад..ёмнік, малакроў..е, п..яўка, батал..ён, ад..езд, шампін..ён, пашталь..ён, аб..яднанне, вал..ер.

***8. Змяніце словы так, каб замест літары т пісалася літара ц, а замест д – дз.***
Сад, самалёт, лад, ледаход, блакіт, побыт, буду, два, росквіт.

***9. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.***
Пакры..джаныя каласы пагля..елі на неба, дзе праплывалі лё..кія аблокі.
– І..іце да нас, на з..млю! – гукнулі аблокі. – У нас тут ..тульней, ..яплей.

***10. Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі.***
Як зачар..ваны стаіць лес. Апусцелі пач..рнелыя галінкі лісц..вых дрэў і толькі сосны, ..ліны ды кусты ..длоўцу вызначаю..а сваёй устойлівай з..л..нінай. Сям-там выглядваюць з-пад снегу в..чназ..лёныя кусцікі брусьнічніку і в..расу. Добра вытрымлівае мар..зы мох, з..зюлін лён, які пасля адміра..я ўтварае торф. Ц...жка прыходзі..а зімой жыхарам лес.. . Глыбокі сне..

ускладняе ім пошук ..жы, не дазваляе ім рабіць доўгі.. пераходы. М..л..дымі галінкамі ..сіны, б..розы кормяцца ласі і ка..улі.

Лісіца, гарнастай, за..ц-б..ляк становяцца цяпер зусім невідзімкамі і б..лізной свайго футра гатовы пасап..рнічаць са снегам. Гэтым хоць у адносінах маскіроўкі пашанцавала – паспрабуй разгл..дзі іх с..род б..змежных б..лых прастораў.

11. ***Расстаўце словы ў алфавітным парадку, устаўляючы прапушчаныя літары.***

Токі.., тры.., рады.., сальфеджы.., ч..мпі..н, р..корд, інж..нер, прац..дура, камп'ют..р, аквары..м, дз..вяты.

***12. Запішыце словы, ужыўшы іх з прыназоўнікамі.***

Горад – у ..., работа – на ..., сад – у ..., дождж – аб ..., рака – на ..., кветка – аб ..., луг – на ... .

***13. Выпішыце словы, у якіх трэба ўставіць літару е.***

Б..роза, б..рвяно, с..кера, м..даль, гл..дач, сн..жынка, інтэрн..т, с..мнаццаць, с..мсот, к..фір, г..рой, л..генда.

***14. Падкрэсліце ў словах арфаграмы.***

Шчаўе, шарэць, распісацца, снегіры, Ульяна, блізкі, каменне, цвёрды, адпісаць.

## IV узровень

1. ***Выпраўце памылкі ў словах.***

Сьмех, вазьму, збіраць, пісменнік, сямья, жыцьцё, людзі, верабы, песьня, толкі, насеньне.

2. ***Спішыце, замест кропак устаўце прапушчаныя літары.***

А..радром, т..леграма, т..рмометр, ц..мент, орд..н, д..путат, т..атр.

3. ***Устаўце прапушчаныя літары** е **або** я **і падбярыце словы, блізкія па значэнні. Запішыце.***
Н..здаровы, н..далёкі, н..вясёлы, н..вялікі, н..лёгкі.
*Словы для даведкі:* блізкі, хворы, сумны, малы, цяжкі.

4. ***Падбярыце да прыметнікаў адпаведныя назоўнікі і складзіце словазлучэнні. Запішыце, устаўце прапушчаныя літары** е **або** я.*
Кв..цісты, мес..чны, з..лёны, сн..гавы, вос..ньскі, п..радавы.

5. ***Змяніце словы або ўтварыце новыя так, каб замест й стала і. Спісваючы, словы дзяліце на склады.***
Герой, музей, ураджай, падвойваць, засвойваць.
*****Падабраць да назоўнікаў ручай і ўраджай адпаведныя прыметнікі.***

6. ***Устаўце замест кропак і або й. Выпішыце словы на правапіс звонкіх і глухіх зычных.***
Уюцца зме..ка.. срабрыста.. дарожкі. Над галавою празв..нела пругк..мі крыллямі ста..ка дз..кіх качак. Прыемна было ..сці па зялёным муражку пад ц..хі шэпт калосся. Раніца.. хлопцы вы..шлі на ўзгорак.

7. ***Скласці са слоў сказы. Запісаць іх. Уставіць прапушчаныя літары.***
Застала, лесе, у, н..ч, паля..нічых.
Каля, яны, вырашылі, кастра, н..чаваць.
Матылі, ляцелі, н..чныя, агонь, на.

8. ***Да слоў з выдзеленымі зычнымі падбярыце словы з адпаведнымі глухімі і запішыце іх. З адной з пар слоў складзіце сказы.***
**Ж**ар, **д**зень, **г**рыб, зуб.

9. ***Змяніце словы ў дужках па сэнсу. У гэтых словах***

***вызначце колькасць гукаў і літар.***

Позняй (восень) дні кароткія, а ночы доўгія. Глыбокай (ноч) неба зацягнулася хмарамі. Пайшоў густы снег. Дрэвы апранулі белае (убор).

***10. Падзяліце на сказы. Спішыце, замяніўшы словы хлопчыкі і дзяўчынкі імёнамі. Пастаўце, дзе трэба, кропкі, коскі.***

Многа добрых спраў вясной у дзяцей хлопчыкі майструюць шпакоўні дзяўчынкі падмятаюць вуліцу.

***11. Утварыце словы пры дапамозе прыставак з-, уз-, раз-, без (бес-), с-, над-, ад-.***

***12. Спішыце і ўстаўце прапушчаныя канчаткі назоўнікаў мужчынскага роду роднага склону адзіночнага ліку.***

Недалёка ад лес.., расце каля га.., кілаграм цукр.., кроплі даждж.., фундамент з бетон.., кашуля з паркал.., машына graві.., раскаты гром.., кілаграм гарох.. .

***13. Напішыце словы правільна.***

Верабьі, ніскі, казьба, вілейка, ліджба, сжаў, сёня, цьвіцене, барадзьба, павіл’ён.

***14. Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі.***

Многа (цукар), плысці на (лодка), падзякаваў (бабуля, журы), чытаў (Якуб Колас), ганарыцца (маці, таварыш), іграць на (гармонік, піяніна).

***15. Ад наступных слоў утварыце новыя словы з падоўжанымі зычнымі.***

Галінка, восень, колас, вулей, лес, крыло.

***16. Запішыце словы па-беларуску.***

Директор, текст, студент, терем, тема, секрет, лидер, скутер, сердце, телеграмма.

***17. Запішыце адным словам.***

- Ён фарбуе сцены, падлогу, дзверы;
- месца, дзе жывуць людзі;
- чорная смалістая маса для пакрыцця дарог, вуліц, тратуараў;
- пульхнае салодкае печыва з цеста, у якое пакладзена шмат жаўткоў і бялковай пены;
- гульня-задача, у якой фігуру з перакрыжаванымі радамі клетак патрэбна запоўніць літарамі так, каб па вертыкалях і гарызанталях атрымаліся патрэбныя словы.

***18. Спішыце, выпраўляючы памылкі. Абазначце род назоўнікаў.***

Дзьверы, пальто, мітро, потпіс, жіраф, мідаль.

***19. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце скланенне і склон назоўнікаў.***

Дразды в..ртаю..а (з, с) по..дня ра..яй в..сной. (С, З) пачатку птушкі набіраю..а сіл пасля ця..кай дарогі. Ажы..ляюцца дразды, калі (ў,у) лесе з..яўляюцца праталіны. Цэлымі (над)в..чоркамі яны ся..яць на елках і перагукаюцца мі(ж, ш) сабой. Закрасуюцца першыя в..снавыя кветкі, і дразды заспяваюць су..кі навылё.. .

***20. Устаўце літары з або с. Падкрэсліце назоўнікі.***

Ра..казаць, ра..мова, ра..губіцца, ра..шпіліць, ра..гневацца, бе..дапаможны, бя..конца, бе..клапотны.

***21. Выпраўце памылкі ў сказах.***

Снех рыпіць і асідае пат цяшкімі крокамі. Асноуны закон рыспублікі беларус – канстітуцыя рыспублікі беларус. С лесной вуліццы ішлі падароге троя мушчын.

22. ***Выпішыце словы, у якіх неабходна ўставіць літару т.***
Пос..ны, сапраў..ны, кантрас..ны, экскурсан..кі, брэс..кі, фу..бол, па..кормка, ло..ка, грун.., кла..ка, салда..чына.

23. ***Пастаўце назоўнікі ў форме роднага склону:***
смак, агурок, тавар, завод, страх, цукар, горад, палын, Мінск, метр.

24. ***Запішыце, раскрываючы дужкі.***
(Па)ехала (у ) горад, (не) закончыла маляваць (не) забудку, (пад)ышла (да) трамвая, (не) расказаў (не)быліцу, (не) слух (не) спіць, (з)мерз (на) марозе.

**V узровень**

1. ***Які гук любіць "хавацца" ў словах? Як ён гэта робіць?***

2. ***Якое слова складаецца з двух гукаў, а на пісьме перадаецца адной літарай?***

3. ***Які агульны гук знаходзіцца ў наступных словах?***
а) Майка, елка, ёд;
б) Вяз, зала, лаз.

4. ***Напішыце 10 слоў, у якіх літары е, ё, я, ю абазначаюць два гукі.***

5. ***Выпішыце пятае "лішняе".***
а) Якар, аб'ява, лязо, шыя, акіян.
б) Здароўе, зерне, калье, марожанае, сузор'е.

6. ***Трэба падабраць па 5 форм слова або новых слоў з тым жа коранем, каб о, э пераходзілі ў а.***
Словы для даведкі: голас, колас, ноч, цэлы.

7. ***Успомніце і запішыце як мага больш мужчынскіх і жаночых імёнаў, якія пачынаюцца з [э].***

8. ***Запішыце адным словам.***

а) Той, хто займаецца з кім – небудзь дадаткова.
б) Найлепшы вынік, дасягнуты ў спорце.
в) Першае выступленне артыста на сцэне.

***9. Запішыце мужчынскія і жаночыя імёны з літарай я ў першым складзе перад націскам.***

***10. Па скарочаных імёнах запішыце іх поўныя адпаведнікі.***
Валік, Дзіма, Саша, Сяржук, Жэня.

***11. Якія назвы дзён тыдня падпарадкоўваюцца правілу пераходу е ў я ў першым складзе перад націскам?***

***12. Устаўце прапушчаныя літары, знайсці і падкрэсліць пятае "лішняе".***
Ап..льсін, б..нзін, б..тон, віц..блянін, ф..ль..тон.
Л..док, з..мляк, см..льчак, сн..гір, ф..номен.

***13. Чым падобны назоўнікі*** *плод* ***і*** *плот****?***

***14. Колькі гукаў [т] знаходзіцца ў наступным сказе?***
Дзед Антон адчыніў вароты.

***15. Запішыце словы. Падкрэсліце "лішнія".***
Лы(ж,ш)ка, сту(ж,ш)ка, сырае(ж,ш)ка,
качарэ(ж,ш)ка, кні(ж,ш)ка, сце(ш,ж)ка,
перабе(ш,ж)ка, бро(ж,ш)ка, ду(ш,ж)ка, дзе(ш,ж)ка,
стры(ш,ж)ка, мо(ж,ш)ка.

***16. Як правільна прачытаць словы*** *езджу, паездка, грузчык****? Запішыце іх у фанетычнай транскрыпцыі.***

***17. Якія імёны пішуцца праз апостраф?***

***18. У назвы якіх беларускіх гарадоў уваходзіць гук [ў]?***

***19. Спішыце. Падкрэсліце пятае “лішняе”.***
Адкрыццё, бессмяротнасць, вуголле, змяненне, ралля.

***20. Напішыце словы з падвоенымі зычнымі на стыку прыстаўкі і кораня.*** *Напрыклад: рассыпаць, аддаліць.*

***21. Размяркуйце словы ў 4 слупкі па арфаграмах, устаўляючы прапушчаныя літары.***
..агілёў, гру..чык, міл..ярд, ..амёнаў, аб..ектыў, про..ба, медал..ён, конь ..аштан, навако..е, двухкроп..е, ..віцязь, гла..кі, здаро..е, су..я, ..ёман, звяр..ё, вясе..е, ра..ада, здзіўле..е, рэ..ка.

**22. Выпраўце памылкі, падбярыце праверачныя словы.**
Разветка -..., развяска - ..., ношка -.... мозх -..., нозьбіт - ..., загатка - ..., ракетка -..., калодзеш - ... .

***23. Падбярыце аднакаранёвыя словы так, каб націскныя о, э сталі не пад націскам.***
Навокал, восень, спрэчка, папрок, поспех, цэгла, сустрэча, мова.

***24. Перакладзі на беларускую мову.***
Глоток воды, центральный вход, сладкое яблоко, шестеро учеников, дружные ученики, Сморгонский район, обойти возле урны.

***25. Устаўце у або ў.***
Шо...к, рады...с, тра...ка, па...за, а...кцыён, палко...нік, со...с, прэзіды...м, стра...с, а...тобус, но...тбук.

***26. Запішыце 10 дзеясловаў, якія заканчваюцца на -цца.***

***27. Утварыце новыя словы ад слова*** *ісці* ***пры дапамозе прыставак*** *пад- , па- , аб- , вы- .*

***28. Утварыце і запішыце новыя словы з двух слоў.***

Сонца+пячы, чорная+зямля, востры+верх, лёгкія +крылы, пыл+сасаць, жывёла+гадаваць, збожжа+убіраць, фота+здымаць.

***29. Пры дапамозе суфікса -ск- утварыце, дзе магчыма, прыметнікі ад назоўнікаў, якія абазначаюць поры года і назвы месяца.***

## Адказы да раздзела "Арфаграфія"

### III узровень

1. Цырульня адкрываецца,
   Хутчэй, хутчэй бяжы!
   Зуброў, мядзведзяў, зайцаў -
   Усіх стрыгуць стрыжы.
2. Галубка, стужка, кніжка, бярозка, вучышся, касьба, крышка, пробка, склад, мелодыя, далечыня, перон, цягавіты, Пятрусь, поезд, снегавік, гербарый, майстар, шніцаль, прывязь, бухгалтар, снягір.
3. Ко́рань – карэ́нне, го́лас – галасы́, ро́зум – разу́мны, зво́н – званіць, шо́ўк – шаўко́вы , ко́лас – кало́ссе, го́ман – гаманіць, шэ́рсць – шарсцяны́.
4. Колас – калоссе, печ – печчу, суд – суддзя, высь – выссю, багаты – багацце, сук – сучча, жыць – жыццё.
5. Мёд – мядо́вы, клён – кляно́вы, цвёрды – цвярдзе́йшы, дзе́нь – дзянёк, сле́д – сляды́, ле́с – лясны́, пе́нь – пянёк, сце́ны – сцяна́.
6. Агарод – агароды, слуп – слупы, бераг – каля берага, смех – смеху, абруч – абручы, нож – нажы, казка – казаць, дубкі – дубы.
7. Рэльеф, лье, сям'я, п'еса, ад'езд, павільён, здароўе, мільён, Юльян, пад'ёмнік, малакроўе, п'яўка, батальён,

ад’езд, шампіньён, паштальён, аб’яднанне, вальер.

**8.** Сад – у садзе, самалёт – на самалёце, лад – у ладзе, ледаход – на ледаходзе, блакіт – у блакіце, побыт – аб побыце, буду – будзе, два – дзве, росквіт – у росквіце.

9. Пакрыўджаныя каласы паглядзелі на неба, дзе праплывалі лёгкія аблокі.

– Ідзіце да нас, на зямлю! – гукнулі аблокі. – У нас тут утульней, цяплей.

**10.** Зачараваны, пачарнелыя, лісцевых, яліны, ядлоўцу, вызначаюцца, зелянінай, вечназялёныя, верасу, маразы, зязюлін, адмірання, цяжка, прыходзіцца, лесу, снег, ежы, доўгія, маладымі, асіны, бярозы, казулі, заяц-бяляк, белізной, пасапернічаць, разглядзі, сярод, бязмежных, белых.

**11.** Акварыум, дзявяты, інжынер, камп’ютар, працэдура, радыё, рэкорд, сальфеджыа, Токіа, трыа, чэмпіён.

**12.** Горад – у горадзе, работа – на рабоце, сад – у садзе, дождж – аб даждджы, рака – на рацэ, кветка – аб кветцы, луг – на лузе.

**13.** Бервяно, медаль, семсот, кефір, герой, легенда.

**14.** Шчаўе, шарэць, распісацца, снегіры, Ульяна, блізкі, каменне, цвёрды, адпісаць.

## IV узровень

**1.** **С**мех, вазьму, збіраць, пісьменнік, сям**’**я, жы**цц**ё, людзі, вераб’і, пе**с**ня, тол**ь**кі, насе**нн**е.

2. Аэрадром, тэлеграма, тэрмометр, цэмент, ордэн, дэпутат, тэатр.

**3.** Нездаровы – хворы, недалёкі – блізкі, невясёлы – сумны, невялікі – малы, нялёгкі – цяжкі.

**4.** Квяцісты луг, месячны план, зялёны дуб, снегавы дом, восеньскі дзень, перадавы атрад.

**5.** Ге-рой – ге-ро-і, му-зей – му-зе-і, у-ра-джай – у-ра-джа-і, па-двой-ваць – па-дво-іць, за-свой-ваць – за-сво-іць. Хуткі ручай, вясенні ручай, імклівы ручай; добры ўраджай, багаты ўраджай, новы ўраджай.

6. Уюцца змейкай срабрыстай дарожкі. Над галавою празвінела пругкімі крыллямі стайка дзікіх качак. Прыемна было ісці па зялёным муражку пад ціхі шэпт калосся. Раніцай хлопцы выйшлі на ўзгорак.
Даро**ж**кі, пру**г**кімі, мура**ж**ку.

**7.** Ноч застала паляўнічых у лесе.
Яны вырашылі начаваць каля кастра.
Начныя матылі ляцелі на агонь.

**8.** **Ж**ар – **ш**ар, **д**зень – **ц**ень, **г**рыб – **х**рып , **з**уб – **с**уп.
Андрэйку моцна балеў зуб. Матуля прыгатавала смачны суп.

**9.** Позняй **восенню** (6 гукаў, 7 літар) дні кароткія, а ночы доўгія. Глыбокай **ноччу** (4 гукі, 5 літар) неба зацягнулася хмарамі. Пайшоў густы снег. Дрэвы апранулі белае **ўбранне** (6 гукаў, 7 літар).

**10.** Многа добрых спраў вясной у дзяцей. Коля, Паша і Вася майструюць шпакоўні. Наташа, Саша, Люда падмятаюць вуліцу.

**11.** Збегаць, раззброіць, узляцець, сшыць, безбілетны, бескарысны, надкалоць, адкінуць.

**12.** Недалёка ад лес**у**, расце каля га**ю**, кілаграм цукр**у**, кроплі дождж**у**, фундамент з бетон**у**, кашуля з паркал**ю**, машына гравію, раскаты гром**у**, кілаграм гарох**у** .

**13.** Вераб'і, нізкі, ка**сь**ба, **В**ілейка, лі**ч**ба, **з**жаў, сё**нн**я, **цв**іце**нн**е, бара**ц**ьба, паві**ль**ён.

**14.** Многа цукру; плысці на лодцы; падзякаваў бабулі, журы; чытаў Якуба Коласа; ганарыцца маці, таварышам; іграць на гармоніку, піяніна.

**15.** Галінка – галлё, колас – калоссе, лес – узлессе, восень – асенні, вулей – вуллі, крыло – крылле.

**16.** Дырэктар, тэкст, студэнт, церам, тэма, сакрэт, лідар, скутар, сэрца, тэлеграма.

**17.** Маляр, жыллё, асфальт, бісквіт, красворд.

**18.** **Дз**веры (няма роду), пал**і**то (н. р.), м**е**тро (н.р.), под**п**іс( м.р.), ж**ы**раф**а** (ж.р.), м**е**даль (м.р.).

**19.** Дразды (2 скл., Н.) вяртаюцца з поўдня (2 скл., Р.)

ранняй вясной (1скл., Т.). Спачатку птушкі (1скл., Н.) набіраюцца сіл (1скл., Р) пасля цяжкай дарогі (1скл., Р). Ажыўляюцца дразды (2 скл., Н.), калі ў лесе (2скл., М.) з'яўляюцца праталіны (1скл., Н.). Цэлымі надвячоркамі (2 скл., Т.) яны сядзяць на елках (1 скл., М.) і перагукаюцца між сабой. Закрасуюцца першыя веснавыя кветкі (1скл.,Н.), і дразды (2 скл., Н.), заспяваюць суткі (В.) навылёт.

**20.** Ра**с**казаць, размова, ра**з**губіцца, ра**с**шпіліць, ра**з**гневацца, бе**з**дапаможны, бя**с**конца, бе**с**клапотны.

**21.** Сне**г** рыпіць і ас**я**дае па**д** ця**ж**кімі крокамі.
Асно**ў**ны **З**акон **Р**эспублікі **Б**еларус**ь** – **К**анст**ы**туцыя **Р**эспублікі **Б**еларус**ь**.
**З** л**я**сной вулі**ц**ы ішлі **па** дарозе тро**е** му**ж**чын.

**22.** Фу**т**бол, грун**т**, салда**т**чына.

**23.** Смаку, агурка, тавару, завода, страху, цукру, горада, палыну, Мінска, метро.

**24.** Паехала ў горад, не закончыла маляваць незабудку, падышла да трамвая, не расказаў небыліцу, неслух не спіць, змерз на марозе.

## V узровень

**1.** Гук [й'] любіць "хавацца" ў словах. Калі ён выступае ў спалучэнні з гукамі [а],[о],[э],[у], то разам з галоснымі абазначаецца літарамі я,ё,е,ю.

**2.** Я – [й'а].

**3.** а) Майка, елка, ёд – гук [й'].
б) Вяз, зала, лаз – гук [а].

**4.** Елка, вадаём, юнак, шыя, пад'ём, яблык, паядынак, якар, акіян, серыя.

**5.** а) Лязо. Літара я абазначае ў ім гук [а], у іншых словах – гукі [й'а].
б) Зерне. Літара е абазначае адзін гук [э], у іншых словах літара е абазначае два гукі [й'э].

**6.** Голас – галасы, галасіць, галосны, пагалоска, галасаваць; колас – каласы, каласаваць, каласіцца, каласок, адкаласаваць; ноч – начны, начлег, начнік, уначы, начаваць;

цэлы – ацалець, цалік, цаліна, цалінны, цалюткі.

**7.** Эвальд, Эдмунд, Эдуард, Эміль, Эрык, Эма,Эльза, Эмілія, Эльвіра.

**8.** а) Той, хто займаецца з кім-небудзь дадаткова – рэпетытар.
б) Найлепшы вынік, дасягнуты ў спорце – рэкорд.
в) Першае выступленне артыста на сцэне – дэбют.

**9.** Аляксáндр, Аляксéй, Валянцíн, Дзямíд, Дзянíс, Лявóн, Няфёд, Пятрó, Сняжáна, Фядóра, Святлáна, Зянóн.

**10.** Валік – Валянцін (-а), Дзіма – Дзмітрый, Саша – Аляксандр (-а), Сяржук – Сяргей, Жэня – Яўген (-ія).

**11.** Пан**я**дзéлак, н**я**дзéля.

**12.** Ап**е**льсін, б**е**нзін, б**е**тон, віц**я**блянін, ф**е**ль**е**тон.
Л**я**док, з**я**мляк, см**я**льчак, сн**я**гір, феномен.

**13.** Назоўнікі *плод* і *плот* аднолькава вымаўляюцца: [плот].

**14.** Дзед Антон адчыніў вароты. (3 гукі [т])

**15.** Лыжка, стужка, сыраежка, качарэжка, кніжка, сцежка, перабежка, брошка, дужка, дзежка, стрыжка, мошка.

**16.** [й'эжджу], [пай'эстка], [грушчык]

**17.** Дар’я, Дзям’ян, Лукер’я, Мар’я.

**18.** Барысаў, Быхаў, Ваўкавыск, Крычаў, Магілёў, Слаўгарад.

**19.** Адкрыццё, бессмяротнасць, вуголле, змяненне, ралля .

**20.** Рассмяшыць, раззваніць, бясслаўны, бясснежны, раззлаваць, паддубавік.

**21.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Магілёў | грузчык | мільярд | наваколле |
| Сямёнаў | просьба | аб’ектыў | суддзя |
| Каштан | гладкі | медальён | вяселле |
| Свіцязь | рэзка | двухкроп’е | здзіўленне. |
| Нёман | | звяр’ё | |

**22.** Разве**д**ка – разведаць, развя**з**ка – развязаць, но**ж**ка – ножанька, моз**г** – мазгі, но**сь**біт – носіць, зага**д**ка – загадаць, ракетка – ракета, калодзе**ж** – калодзежы.

**23.**

| | |
|---|---|
| Навóкал – навакóлле | вóсень – асéнні |
| спрэ́чка – спрачáцца | папрóк – папракáць |
| пóспех – паспяхóва | цэ́гла – цагля́ны |
| сустрэ́ча – сустракáць | мóва – маўлéнчы. |

**24.** Глыток вады, цэнтральны ўваход, салодкі яблык,

шасцёра вучняў, дружныя вучні, Смаргонскі раён, абысці каля урны.

**25.** Шоўк, радыус, траўка, паўза, аўкцыён, палкоўнік, соус, прэзідыум, страус, аўтобус, ноўтбук.

**26.** Смяяцца, купацца, прытуляцца, капацца, весяліцца, трымацца, баяцца, валяцца, гнацца, злавацца.

**27.** Падысці, пайсці, абысці, выйсці.

**28.** Сонцапёк, чарназём, востраверхі, лёгкакрылы, пыласос, жывёлагадоўля, збожжаўборка, фотаздымак.

**29.** Восеньскі, студзеньскі, майскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, жнівеньскі, снежаньскі.

## VI. Фразеалогія

Слова! Яно неабсяжнае, як сусвет, невычэрпнае, як акіян.
Слова ўсюды прысутнае і скрозь дасягальнае, нібы тыя радыёхвалі.
Слова ўсемагутнае, бо закранае самыя тонкія струны душы чалавечай …

*Уладзімір Юрэвіч*

### III узровень

***1. Растлумачце значэнне фразеалагізмаў з дапамогай сінанімічных слоў з правага слупка.***

| | |
|---|---|
| абуць у лапці | ашукаць, падмануць, падвесці |
| лёгкі на язык | балаваць, песціць |
| мазоліць вочы | балбатлівы, гаваркі |
| насіць на руках | блізка, недалёка, побач |
| рукой падаць | дакучаць, назаляць |

***2. Спішыце, замяняючы выдзеленыя словы фразеалагізмамі.***

Гадзіны са тры хлопчык трымаўся, а потым пачаў **драмаць**. Усю ноч Віктар не **заснуў**, чакаў прыезду брата. Юрась зноў забраўся на печ,улёгся жыватом на чарэнь, **прыслухаўся**. Работы **многа**, а дзень кароткі. Але наш народ нельга было **скарыць** і прымусіць пакорліва **працаваць** у прыгонніцкім ярме.

**Словы для выкарыстання:** гнуць спіну, звесці вочы, кляваць носам, навастрыць вушы, непачаты край, паставіць на калені.

***3. Злучы стрэлкамі фразеалагізм з адпаведным значэннем.***

| | |
|---|---|
| а) вушы натапырыць | а) вельмі дружна, у поўнай згодзе жыць |
| б) за адным махам | б) хутка (павінна адбыцца штосьці) |
| в) душа ў душу | в) насцярожыцца, з вялікай увагай слухаць |
| г) не сёння-заўтра | г) гаварыць абы-што, без толку балбатаць |
| д) языком малоць | д) заадно, адначасова, з чым-небудзь другім. |

***4. Выпішыце са сказаў фразеалагізмы.***

1) На свеце толькі той шчасце мае, хто сябра ў руках трымае. Дзяўчынка трымае ў руках невялікі збаночак.
2) Заданне тваё, Васілёк, не лёгкае. Але ці варта нам апускаць рукі? Мама прысела на край ложка, стомлена апусціла рукі на прыпол.
3) Кравец закінуў вуду і прымасціўся сесці над самай вадой. " Ты да нас у калгас ідзі, дык мы табе змалоцім збожжа", – закінуў вуду Юзік.

***5. Выпішыце са сказаў Якуба Коласа фразеалагізмы і растлумачце іх значэнне.***

1. Перш чым звязваць сябе з той ці іншай партыяй, трэба ўважліва прыгледзецца, каб правільна выбраць дарогу. 2. Я зноў хачу, як і калісьці, з адкрытай, простаю душой на стык дарог знаёмых выйсці і пераклікнуцца з табой. 3. Насця нічога не сказала і толькі ўздыхнула, а Кузьма разгарачыўся, і панёсся як малады неаб'езджаны конь. 4. А жанкі глядзяць здзіўлёна, кінуць слоўка шапатком. 5. Дай бог шчасця вам і долі ўсім, хто слёзы праліваў.

***6. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх сінонімамі. Адказ запішыце.***

| | |
|---|---|
| Аднаго поля ягады | Ва ўсякім выпадку |

| | |
|---|---|
| Адным махам | Збірацца з сіламі |
| Па крайняй меры | Абое рабое |
| Набірацца духу | За адзін прысест |

***7. Аднавіце "рассыпаныя фразеалагізмы". Паспрабуйце злучыць словы (прыметнікам неабходна надаць патрэбную форму) у фразеалагічныя звароты.***

кітайскі лета
парахавы іскра
бабін душа
шчодры бочка
божы грамата

***8. Устаўце прапушчаныя словы.***

Прыкусіць … .
Як … з'еўшы.
Лезці на … .
Ні пуху, ні … .
Мокрая … .

***9. Растлумачце значэнне фразеалагізмаў і складзіце з імі сказы.***

Абое рабое, задзіраць нос.

**10. Замяніце фразеалагізм словам, блізкім па значэнні.**

Кату па пяту; блізкі свет; засесці ў галаву; на самай справе; скаліць зубы.

## IV узровень

***1. Наступныя словы замяніце адным словам.***

Ва ўвесь дух– …
У час па чайнай лыжцы – …
Куды Макар цялят не ганяў – …
Як пшаніцу прадаўшы– …
Як Піліп з канапель– …

2. ***Вядома, што словы ў крылатых выразах не замяняюцца, цесна звязаны паміж сабою як адзінае цэлае, і размяшчаюцца адзін за адным у строга ўстаноўленым парадку. Успомніце крылатыя выразы з казак і запішыце іх, выправіўшы памылкі.***

Біты нябітага нясе; стань перада мною, як конь перад травою; па воўчым загадзе; певень наплакаў; шпаковы слёзы.

3. ***Падзяліце выразы на дзве групы па аднолькавым сэнсе, запішыце іх.***

Ва ўвесь дух; праз пень-калоду; зламаўшы галаву; нага за нагу; на ўсе манюткі; з усіх ног; адным махам; адна нага тут, другая там.

4. ***Здагадайцеся і запішыце, якія назвы жывёл уваходзяць у наступныя выразы.***

Галодны як …; выць…; як з … вада; … ногі кормяць; як … у калясе; легчы спаць з …; надуты як …; надакучлівы як …, нямы як …; … падкласці.

5. ***Упрыгож тэкст, замяніўшы некаторыя словы ў тэксце фразеалагізмамі.***

Усе сядзелі моўчкі. Яшчэ ўчора вырашылі сабрацца разам, каб паразважаць. Заяц у школьным садзе абгрыз тры яблынькі. Людзям ён стараецца не паказвацца, а сляды пакідае.

- Так і будзем сядзець?
- Трэба зайца абхітрыць.

Вырашылі абкруціць яловымі галінкамі ствалы яблынь. Няхай цяпер заяц паспрабуе падлезці!

*Фразеалагізмы:* абвесці вакол пальца, як вады ў рот набраўшы, сунуць нос, раскінуць розумам, біць лынды, трапляцца на вочы.

6. ***Замяніце фразеалагізмы словам, блізкім па сэнсе.***

Падаць рукой, абуць у лапці, пускаць туман у вочы, быць на сёмым небе, непачаты край.

7. ***Растлумачце значэнне фразеалагізмаў.***
Спусціўшы рукавы, намыліць шыю, пераліваць з пустога ў парожняе, абвесці вакол пальца.

8. ***Устаўце прапушчаныя словы ў фразелагізмы***
Вывесці на чыстую … ; з'есці пуд … ; з … зрабіць слана; палец ў … не кладзі; … пускаць у вочы; у нагах … няма.

9. ***Запішыце фразеалагізм, якім можна назваць***
а) прадмет;
б) прымету;
в) дзеянне.

10. ***Адкажыце на пытанні.***
а) Пра каго можна сказаць, што ён кату па пяту?
б) Пра каго кажуць, што ён выйшаў у людзі?
в) Пра каго кажуць, што ён за словам у кішэню не лезе?
г) Пра каго кажуць, што ў яго галава на плячах?
д) У каго можа быць сем пятніц на тыдні?
е) Пра каго кажуць, што ён ад рук адбіўся?

## V узровень

1. ***Запішыце фразеалагізмы , у складзе якіх ёсць прыметнік*** чорны ***ці*** белы.

2. ***Слова*** залацінкі ***запісана вертыкальна. Падбярыце фразеалагізмы, якія пачынаюцца з пэўнай літары слова.***
З -
А-
Л-
А-
Ц-
І-

Н-
К -
І-

***3. Закончыце сказы фразеалагізмамі.***

Чалавек калаціўся як … . Кожны блізка, недалёка, кожны з іх жыве … . Здаровы ён у вас, кулаком быка можа зваліць, а ў галаве … . Нешта, значыцца, здарылася, і мне трэба … . Максім хутка запамінае новы матэрыял – … . За нашу ігру нам доўга пляскалі ў ладкі, і мы былі, як гаворыцца … .

***4. Успомніце і запішыце фразеалагізмы, у якіх сустракаецца слова*** галава.

***5. Падбярыце да наступных фразеалагізмаў рускай мовы адпаведныя па значэнні фразеалагізмы беларускай мовы і запішыце іх парамі.***

Без задних ног – … , бить баклуши – …, два сапога пара – …, от горшка два вершка – …, в кой-то веки –…, втирать очки – …, моё дело – сторона –… .

***6. Падбярыце антонімы да значэнняў фразеалагізмаў .***

У час па чайнай лыжцы, капля ў моры, у імгненне вока.

*7.* ***Запішыце, якія фразеалагізмы мы ўжываем, калі гаворым***

а) пра тое, што трэба добра запомніць;
б) пра чалавека, які адчувае сваю віну, паводзінамі выдае сябе;
в) аб захапленні нязбытнымі марамі, планаванні нездзяйсняльнага.

**8.** ***Фразеалагізмы ўзніклі і ўзнікаюць па-рознаму. Часта здаралася так, што ў выніку нейкай падзеі або на аснове міфа ці літаратурнага твора ствараўся выраз, які потым замацоўваўся і ўжываўся наступнымі пакаленнямі. Вам неабходна вызначыць фразеалагізмы, якія ўзніклі з прычыны згаданых падзей***

а) Аднойчы, паводле старажытнагрэцкага міфа, цар Крыта Мінас наклаў на Афіны пакаранне за забойства свайго сына: кожныя 9 гадоў афіняне павінны былі дасылаць па 7 хлопцаў і дзяўчат на Крыт, дзе іх з'ядаў пачварны Мінатаўр, ён жыў у лабірынце, з якога немагчыма было знайсці выйсце. Афінскі герой Тэсей вызваліў свой край ад гэтай бяды. Але ён не змог бы перамагчы Мінатаўра без дапамогі дачкі Мінаса. Яна дала яму меч і клубок нітак, які вывеў яго з лабірынта… А з гэтага міфа нарадзіўся фразеалагізм. Які?

б) Як вы ведаеце з гісторыі, у ноч на 24 жніўня 1572 г. у Парыжы адбылося масавае знішчэнне гугенотаў-пратэстантаў каталікамі. Гэтая разня працягвалася некалькі дзён і прынесла безліч ахвяр. А пачалася яна перад днём аднаго святога, імя якога ўвайшло ў склад устойлівага спалучэння, што ўзнікла на аснове той гістарычнай падзеі. Назавіце гэты фразеалагізм.

в) Наступны ўстойлівы выраз паходзіць з кельцкіх легендаў пра караля Артура. Паводле падання, для таго, каб усе рыцары адчувалі сябе ў караля роўнымі, яны сядзелі не за прамавугольным сталом, а за сталом іншай формы. Якому фразеалагізму дала пачатак гэтая легенда?

***10. Да кожнага слова падбярыце словы з супрацьлеглым значэннем. Замест слоў-антонімаў выкарыстоўвайце фразеалагічныя словазлучэнні з адпаведным сэнсам***

Працаваць – … ;
Мала –… ;
Балбатлівы –… ;
Ілгаць – … .

## Адказы да раздзела "Фразеалогія"

### III узровень

**1.** Абуць у лапці — ашукаць, падмануць, падвесці
лёгкі на язык — балбатлівы, гаваркі
мазоліць вочы — дакучаць, назаляць

насіць на руках — балаваць, песціць
рукой падаць — блізка, недалёка, побач.

**2.** Гадзіны са тры хлопчык трымаўся, а потым пачаў **кляваць носам**. Усю ноч Віктар не **зводзіў вачэй**, чакаў прыезду брата. Юрась зноў забраўся на печ,улёгся жыватом на чарэнь, **навастрыў вушы**. Работы **непачаты край**, а дзень кароткі. Але наш народ нельга было **паставаіць на калені** і прымусіць пакорліва **гнуць спіну** у прыгонніцкім ярме.

**3.** а) вушы натапырыць в) насцярожыцца, з вялікай увагай слухаць
б) за адным махам д) заадно, аднача́сова, з чым-небудзь другім
в) душа ў душу а) вельмі дружна, у поўнай згодзе жыць
г) не сёння-заўтра б) хутка (павінна адбыцца штосьці)
д) языком малоць г) гаварыць абы-што, без толку балбатаць

**4.** На свеце толькі той шчасце мае, хто сябра ў руках трымае. Заданне тваё, Васілёк, не лёгкае. Але ці варта нам апускаць рукі? " Ты да нас у калгас ідзі, дык мы табе змалоцім збожжа", – закінуў вуду Юзік.

**5.**

| № сказа | Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|---|
| 1. | Выбраць дарогу | *Вызначыць, як належыць дзейнічаць* |
| 2. | З адкрытай душой | *Шчыра, даверліва* |
| 3. | Як малады неаб'езджаны конь | *З вялікай хуткасцю* |
| 4. | Кінуць слоўка | *Коратка сказаць аб чым-небудзь* |
| 5. | Праліваў слёзы | *Сумаваў, плакаў* |

**6.**

| | |
|---|---|
| Аднаго поля ягады | Абое рабое |
| Адным махам | За адзін прысест |
| Па крайняй меры | Ва ўсякім выпадку |
| Набірацца духу | Збірацца з сіламі |

7. Кітайская грамата, парахавая бочка, бабіна лета, шчодрая душа, божая іскра.
8. Прыкусіць язык, як мыла з'еўшы, лезці на ражон, ні пуху, ні пер'я, мокрая курыца .
9. Абое рабое — аднолькавыя. Задзіраць нос — задавацца.
10. Кату па пяту – нізка ; блізкі свет –далёка ; засесці ў галаву –думаць аб чымсьці; на самай справе –сапраўды ; скаліць зубы — смяяцца .

## IV узровень

1. Ва ўвесь дух—хутка.
   У час па чайнай лыжцы – марудна.
   Куды Макар цялят не ганяў—далёка.
   Як пшаніцу прадаўшы—моцна.
   Як Піліп з канапель—нечакана.
2. Біты нябітага вязе; стань перада мною, як ліст перад травою; па шчупаковым загадзе; кот наплакаў; кракадзілавы слёзы.
3. а)Ва ўвесь дух; зламаўшы галаву; на ўсе манюткі; з усіх ног; адным махам; адна нага тут, другая там.
   б) Праз пень-калоду; нага за нагу.
4. Галодны як воўк; выць ваўком; як з гусі вада; ваўка ногі кормяць; як вавёрка ў калясе; легчы спаць з пеўнямі; надуты як індык; надакучлівы як муха, нямы як рыба; свінню падкласці.
5. Усе сядзелі **як вады ў рот набраўшы**. Яшчэ ўчора вырашылі сабрацца разам, каб **раскінуць розумам**. Заяц у школьным садзе абгрыз тры яблынькі. Людзям ён стараецца не **трапляцца на вочы**, а сляды пакідае.

- Так і будзем **біць лынды**?
- Трэба зайца **абвесці вакол пальца**.

Вырашылі абкруціць яловымі галінкамі ствалы яблынь. Няхай цяпер заяц паспрабуе **сунуць нос**!

**6.** Падаць рукой – побач; абуць у лапці –падмануць; пускаць туман у вочы –хлусіць; быць на сёмым небе –быць шчаслівым; непачаты край –шмат.

**7.** Спусціўшы рукавы—без належнай стараннасці, абы-як рабіць што-небудзь. Намыліць шыю—біць каго-небудзь, сурова распраўляцца з кім-небудзь. Пераліваць з пустога ў парожняе – займацца бескарыснай, безвыніковай справай, марна траціць час. Абвесці вакол пальца – спрытна, хітра ашукаць, падмануць каго-небудзь.

**8.** Вывесці на чыстую ваду; з'есці пуд солі; з мухі зрабіць слана; палец ў рот не кладзі; пыл пускаць у вочы; у нагах праўды няма.

**9.** -//-

**10.** а) пра невысокага чалавека; б) пра таго, хто стаў паважаным чалавекам; в) пра знаходлівага чалавека; г) пра разумнага, кемлівага чалавека; д) у чалавека, які ўвесь час мяняе свой пункт гледжання; е) пра непаслухмянага чалавека.

## V узровень

**1.** Чорная кошка прабегла, глядзець праз чорныя акуляры, трымаць у чорным целе, чорнае па белым, белая варона, не бачыць белага свету, белыя мухі, шыта белымі ніткамі.

**2.** З – замятаць сляды
А – аршын з шапкаю
Л – лавіць варон
А – апусціць рукі
Ц – цягнуць за язык
І – ісці на свой хлеб
Н – насіць на руках
К – кланяцца ў ногі
І – ісці ў людзі

**3.** Чалавек калаціўся як **асінавы ліст**. Кожны блізка, недалёка ,кожны з іх жыве **пад бокам**. Здаровы ён у вас, кулаком быка можа зваліць, а ў галаве **вецер свішча**. Нешта, значыцца, здарылася, і мне трэба **трымаць вуха востра**. Максім хутка запамінае новы матэрыял – **на ляту схоплівае**. За нашу ігру

нам доўга пляскалі ў ладкі, і мы былі, як гаворыцца на **сёмым небе**.

4. Задраць галаву, мецъ галаву на плячах, хадзіць на галаве, з галавы да ног, з хворай галавы на здаровую, як снег на галаву, акунуцца з галавой, без галавы, біцца галавой аб сцяну, выкінуць з галавы, галава ідзе кругам.
5. Без задних ног—як пшаніцу прадаўшы; бить баклуши—біць лынды; два сапога пара –аднаго поля ягады; от горшка два вершка – кату па пяту; в кой-то веки –гады ў рады; втирать очки – вадзіць за нос; моё дело сторона – мая хата з краю.
6. У час па чайнай лыжцы – хутка. Капля ў моры—шмат. У імгненне вока—марудна
7. а) Зарубіць сабе на носе. б) На злодзеі шапка гарыць. в) Паветраныя замкі будаваць.
8. а) Нітка Арыядны; б) Варфаламееўская ноч; в) Круглы стол;
9. Працаваць – сядзець, склаўшы рукі; мала – хоць гаць гаці; балбатлівы – сядзіць, як вады ў рот набраўшы; ілгаць – гаварыць як на духу, як перад богам, паклаўшы руку на сэрца.

## VII. Праца са сказам і тэкстам

…Слова маці! Цябе перадам я сынам.
Ты – мой скарб дарагі, найсвятлейшая спадчына.
За цябе, калі трэба, жыццё я аддам,
Толькі песня не моўкнула б матчына.
*Я. Крупенька*

## III узровень

1. ***У якім сказе правільна вызначана граматычная аснова?***
   а) Высока ў небе звініць песня жаваранка.
   б) Суніцы паспелі ў лесе.
   в) На палянцы стаіць залаты клён.

2. ***Аднавіце сказ, з якога вылучаны наступныя словазлучэнні, і запішыце яго.***

Старанна будавалі.
Руплівыя мурашы.
Новы дом.

3. ***Вызначце колькі слоў у сказе. Запішыце атрыманы сказ. Вызначце аснову сказа.***
Надлесамвышэйпаднялосясонцаіўсміхнуласязямлі.

4. ***Спішыце, падзяляючы тэкст на сказы. У канцы сказаў пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падбярыце загаловак да тэксту.***
Самая цікавая кніга на свеце – гэта зямля яна з ранняга маленства вучыць нас гісторыі і мове яна адкрывае нам усё новыя і новыя словы кожны дзень мы вучымся спазнаваць і разумець сэнс гэтых слоў усё навокал мае свае імёны на зямлі існуюць мільёны назваў.

5. ***Спішыце, пастаўце, дзе трэба, клічнікі. Падкрэсліце клічныя сказы.***
– Драч, драч,
Бяры дзяркач,
Дзяры дзёран.
А драч – у плач:
– Я і так зморан,
Краў дровы на дрывотні,
Прастудзіўся ў падваротні.
Занядужаў нешта,
Саслабеў дарэшты.
– Не кажы, драч,
Дарэшты –
Горла добра
Дзярэш ты.

6. ***Падкрэсліце дзейнік у кожным сказе.***
а) Маці сустрэла Кацю. б) Маці сустрэла Каця.

7. ***Якія члены сказа з’яўляюцца аднароднымі? Спішыце***

***сказ, падкрэсліце аднародныя члены.***
Халодны дождж спачатку ліў, а пасля імжыў бясконца.
а) дзейнікі; б) выказнікі; в) даданыя члены.

8. ***Пастаўце правільна коскі паміж аднароднымі членамі сказа.***
І гэты край, дзе нарадзіўся рос,
дзе днее вечарэе і світае,
усё – ад зор далёкіх і да рос –
твая радзіма, родная святая. (Р. Барадулін)

9. ***З дадзеных слоў складзіце сказы і запішыце іх. Падкрэсліце галоўныя члены.***
- Хмаркі, на, лёгкія , плывуць, небе.
- Выбегла, лесу, лісічка, з, рыжая.
- Над, бусел, полем, ляціць, белы.

***10. Дапоўніце сказы даданымі членамі.***
Міша едзе. Хмаркі плывуць. Сонейка свеціць. Птушкі спяваюць.

11. ***Дапішыце канчаткі. У сказах падкрэсліце дзейнікі і выказнікі.***
Вось узышла перш.. вячэрн.. зорка. Тонк.. лёгк.. хмаркі афарбаваліся ў залаты колер. Белават.. пялёнкаю ўздымаецца густы туман.

***12. Падкрэсліце словы героя адной рыскай, словы аўтара – дзвюма.***
– Стасік, хутчэй сюды! – закрычала Ірынка. – Ласік зноў да птушанят крадзецца.
– Не пусцім на дрэва, Ласік! – прыгразіў дубцом Стасік.

***13. Падзяліце тэкст на сказы, пастаўце знакі прыпынку.***
У нашых лясах жыве вельмі прыгожая птушачка

каралёк назву яна атрымала дзякуючы прыгожаму адзенню верх у каралька зялёны грудка шараватая на кароткіх крыльцах светлая палоска уздоўж галоўкі з маленькай тоненькай дзюбкай праходзіць яркая чырвона-аранжавая палоска за гэтую залатую карону яе і празвалі каральком.

***** ***Які атрымаўся тэкст?***

***** ***Якія сказы па мэце выказвання?***

***** ***Ператварыце першы сказ у пытальны.***

14. ***Дапішыце словы, якімі патрэбна закончыць сказы.***

У каня заўсёды ёсць … (канюшня, падкова, сядло, грыва).

Год, месяц, тыдзень, мінута – гэта … (час, дзень, даўжыня, век, поры года).

## IV узровень

1. ***У некаторых словах сэнс залежыць ад націску. Прыдумайце і запішыце па два сказы, ужываючы словы*** *рады* ***і*** *нашу* ***ў розным сэнсе.***

2. ***Выберыце словы, што падыходзяць па сэнсе, запішыце тэкст.***

Ціха восенню ў лесе. Апусцелі лясныя *(палі, паляны).*
Апалае лісце цудоўным дыванам засцілае *(зямлю, дрэвы).*
Адлятаюць у вырай *(хмары, птушкі).*
Толькі зрэдку прабягаюць асцярожныя *(волаты, жывёлы).*

3. ***Выпішыце складаныя сказы.***

а) Стаіць казёл над вадою, трасе барадою.
б) Прыйшла з вятрамі восень, шуміць высокі лес.
в) Сонца яшчэ не зайшло, а на блакітным небе ўжо з’явіўся бледны месяц.

4. ***Да кожнага слова ў сказе пастаўце пытанне.***

***Запішыце іх у выглядзе пытальных сказаў.***

а) Слава чытае цікавую кнігу.

б) Даша падарыла маме прыгожыя кветкі.

5. ***Дапоўніце сказы словамі.***

Была … раніца. Сонца … не ўзышло, але … заружавела. …засвістаў шпак. Ён … прыляцеў … . Шпак знайшоў …, сеў і абвясціў, што … настала.

6. ***Запішыце сказ і вызначце, да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя словы.***

[мн’э здавалас’а *са сну*, што й’а бачыла *сасну*]

7. ***Пастаўце знакі прыпынку ў тэксце. Складзіце пабуджальныя сказы на аснове тэксту аб правілах дарожнага руху.***

Кожны школьнік павінен ведаць правілы дарожнага руху вуліцу трэба пераходзіць толькі на зялёнае святло святлафора нельга перабягаць вуліцу перад транспартам, які рухаецца нельга гуляць на дарозе.

8. ***З дадзеных слоў пабудуйце сказы па наступных схемах.***

а) Даданы член, даданы член, дзейнік, выказнік, даданы член.

б) Дзейнік, даданы член, выказнік, даданы член.

в) Даданы член, дзейнік, даданы член, даданы член, даданы член, выказнік.

Купілі, на, мышы, базары, лясным, лыжы.

На, часта, цецярук, дрэве, начуе.

З, вецер, наскрозь, усіх, пранізваў, бакоў, халодны.

9. ***Спішыце, устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары. У апошнім сказе тэкста падкрэсліце галоўныя члены сказа.***

Ба..ька працава.. на ка..байне. Ка..я ..ела побач. Яны а..’яз..алі кругамі ж..тн.. поле. Раніца была ..іхая,

со..ечная. Далёка чу..ся гул матора. Ка..байн выстрыга.. .. загона на залатым моры спелага ж..та ш..рок.. прагалы.

Раптам .. загона выка..ілася спалохан.. а.. гулу зайчаня і шмыгнула пад а..малочаную салому.

10. ***Выпішыце з папярэдняга тэксту па 1-2 словазлучэнні, якія адпавядаюць наступным схемам.***

- Дзейнік + даданы член.
- Дзеяслоў + назоўнік з прыназоўнікам.
- Назоўнік + назоўнік.
- Выказнік + даданы член.

11. ***Складзіце і запішыце сказы, выкарыстоўваючы наступныя словы.***

| Дзейнік | Даданыя члены | Выказнік |
|---|---|---|
| хлопчык | змея<br>з рук<br>папяровага | выпусціў |
| дразды | вясной<br>з поўдня<br>ранняй | вяртаюцца |
| хмара | над зямлёй<br>цёмная | навісла |
| сябры | доўгае<br>раніцай<br>у падарожжа | адправіліся |
| дзяўчынка | спелымі<br>песні<br>ягадамі | слухала і ласавалася |

12. ***Прачытайце тэкст, у якім прапушчаны займеннік ён. Устаўце яго, змяняючы па сэнсе. Падкрэсліце сказ, у якім выражана галоўная думка гэтага тэксту.***

Аднаму здаравеннаму валу здалося, што няма ў свеце

нічога такога, што было б … не пад сілу. Але што б зрабіць такое, каб пераканацца … ў сваёй магутнасці і іншых пераканаць? І вырашыў вол раку спыніць. Улез па жывот у раку і ўпёрся рагамі ў ваду. А вада як цякла, так і цячэ, абплываючы вала з бакоў. Вол раз'юшана напіраў на ваду, але так нічога зрабіць не змог. З нічым і вылез з вады, … быў хоць і вол, але, відаць, зразумеў, што мала мець сілу ў рагах, трэба мець сілу і ў галаве.

***13. Суаднясіце сказы са схемамі.***

1) У невялікай вёсцы стаяла хатка.
2) У хатцы жыла старэнькая і нямоглая бабуля.
3) Бабуля мела вялікага, прыгожага і разумнага ката.
4) Яна карміла яго смятанай ды каўбасой.
5) Кот любіў бабулю, суцяшаў яе.

а) У якой? дзе? ________ ________.
б) _______ ________ каго?, ________ каго?
в) Дзе? ________ якая? і якая? ________.
г) ________ ________ каго? чым? ды чым?
д) ________ ________ якога? якога і якога? каго?

14. ***Складзіце сказы па схемах і запішыце іх. Падкрэсліце галоўныя члены.***

- Хто? што зрабіў? дзе?
- Які?хто?што робіць? куды?
- Што?што зробіць? калі?

15. ***Складзіце па пытаннях сказы з аднароднымі членамі.***

- Якіх беларускіх пісьменнікаў вы ведаеце?
- Якія вялікія рэкі цякуць у Беларусі?
- Якія гарады Беларусі з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі?

16. ***Складзіце сказы з дадзеных слоў і запішыце іх. У канцы сказаў пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.***

- Лета, канчаецца.
- Як, але, свеціць, сонца, горача.
- На, сініцы, ціնькаюць, бярозах.
- Ластаўкі, свае, прабуюць, крылы.
- Збіраюцца, куды, яны.
- Ад, гоніць, што, іх, нас.

## V узровень

1. ***З дадзенымі словазлучэннямі прыдумайце і запішыце сказы.***
   Мяккі снег, мяккае сэрца, мяккі чалавек, мяккая  тканіна.

2. ***Спішыце, выпраўляючы памылкі. Падкрэсліце галоўныя члены сказа і выпішыце словазлучэнні з пытаннямі.***
   Тераз невялікі балотісты лух мы прабіраімся да рэкі Берэзіны.

3. ***Здагадайцеся і запішыце, якія назвы жывёл могуць уваходзіць у словазлучэнні. Складзіце і запішыце два сказы з любымі выразамі.***
   Галодны як …; хітры як …; баязлівы як …; надзьмуты як …; калючы як …; надакучлівы як …; непаваротлівы як …; нямы як … .

4. ***З літар складзіце словы, а са слоў – сказ. Разбярыце гэты сказ па членах.***
   Іцезд, аз, младсе, ішзанйл, агнкмальеа, акжвыо.

5. ***Складзіце са слоў сказы, ужываючы словы з дужак у патрэбнай форме. Зрабіце разбор першага сказа па членах і па часцінах мовы. Скончыце тэкст.***

Крынічка

Летнім, па, лясной, (сцяжынка), ішоў, днём, дзядуля.

Сеў, каля, адпачыць, ён, яра.
(Стаяць), гарачыня. Вельмі, піць, (хацець). Спусціўся, на, дно, дзядуля, яра. < …>
І, цяпер, крынічка, (жыць). Вада, у, ёй, халодная, і, (празрысты). Любяць, яе, каля, людзі, адпачываць.

***6. Дапішыце прыказкі, падкрэсліце галоўныя члены. Да дадзеных членаў пастаўце пытанні.***

* Хлебароба поле… .
* Праца чалавека ўзбагачае, а гультайства… .

***7. Прачытайце. Складзіце са слоў сказы. Запішыце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Вызначце, які гэта тэкст: апавяданне ці апісанне.***

Дзяніска, кардонку, маленькую, адкрыў.
Светлячок, быў, гэта.
Ён, убачыў, агеньчык, светлы.
Хлопчык, вачэй, не, адарваць, цуда, ад, гэтага, мог.
Які, ён, як, зялёны, казцы, у!
Жучок, на, падобны, зорачку, быў, малюсенькую.
Светлячок, на далоні, ляжаў, і, свяціў.

***8. Размясціце словы прыказак і прымавак у правільным парадку. Запішыце іх.***

а) Мазалёў, пад'ясі, паносіш, хлеба.
б) Раскусіш, не, зерня, не, з'ясі, арэх.

***9. Запішыце сказы так, каб атрымаўся жартаўлівы тэкст. Які атрымаўся тэкст?***

Конік стаў сабе падковы падбіваць – і ноч наступіла.
Адна сараканожка прыпаўзла да вожыкавага дома.
Надумаўся вожык госці справіць. Крот выбраў дарогу пад зямлёй і абмінуў вожыкаў дом. Але па дарозе ногі забрудзіла. Чакаў ён іх, чакаў, ды і не дачакаўся.
Пакуль яна чысціла свае сорак ножак, дык вожык лёг спаць. Бяззубка даплыла да берага і далей не змагла ісці.

10. ***Перакладзіце тэкст на беларускую мову.***

Весна пришла неожиданно. С вечера крепчал острый морозик. Солнце несмело и лениво вставало из-за леса. А когда поднялось над лесом, всё изменилось. Иней исчез. Солнце раскрыло широко глаза. И всё сразу зашевелилось. Снег осунулся. С пригорков побежали ручьи. На речке лёд начал отставать от берегов. На склонах пригорков показались чёрные пятна. Над ними поднимался белый пар. Можно было подумать, что земля ворочается и сильно вздыхает после долгого зимнего сна.

11. ***Падзяліце тэкст на сказы. Запішыце іх так, каб атрымаўся тэкст.***

Вавёрчын падарунак

Яна ўзабралася на маладую сасонку і з вялікай цікавасцю пазірала на мяне з гэтым вавёрчыным падарункам я пакрочыў дамоў аднойчы я пайшоў у лес на пушыстым хвасце рыжай вавёркі чырванеў барвовы асінавы лісток раптам лясную сцежку мне перабегла вавёрка шустрая вавёрка спуджана скокнула на высокую сасну я махнуў рукой чырвоны лісток з пушыстага хваста упаў на мой рукаў.

12. ***Падзяліце тэкст на сказы, пастаўце знакі прыпынку, выпраўце памылкі.***

Прыеха.. Вова да деда і бабулі у гості пасля абеду хлопчік пайшоу с дедам у лес … бары спевалі птушкі на прагалінах чырванелі суніцы хлопчік слуха.. песні і ласавауся ягадамі прабыу ён там з дедам аж да самага вечара хораша у лесе

13. ***Затранскрыпіруйце тэкст.***

Нізка звіслі над зямлёю
Хмары снегавыя.
Свішча вецер за сцяною,

У коміне вые.

***14. Складзіце працяг верша.***

Сніцца Пецю добры сон,
Што ляціць у космас ён …

***15. Напішыце выказванне на тэму “Маё захапленне ў вольны час”.***

***16. Прыдумайце пачатак да кожнага радка, каб атрымаўся верш. Дайце яму назву.***

… … свеціць,
… … пяюць,
… … дзеці,
… … ідуць.

## Адказы да раздзела “Праца са сказам і тэкстам”

### III узровень

**1.** а) Высока ў небе звініць песня жаваранка.

**2.** Руплівыя мурашы старанна будавалі новы дом.

3. Над лесам вышэй паднялося сонца і ўсміхнулася зямлі. (У гэтым сказе 8 слоў.)

**4.** Самая цікавая кніга

Самая цікавая кніга на свеце – гэта зямля. Яна з ранняга маленства вучыць нас гісторыі і мове. Яна адкрывае нам усё новыя і новыя словы. Кожны дзень мы вучымся спазнаваць і разумець сэнс гэтых слоў. Усё навокал мае свае імёны. На зямлі існуюць мільёны назваў.

**5.** – Драч, драч,
Бяры дзяркач,
Дзяры дзёран!
А драч – у плач:
– Я і так змoран,
Краў дровы на дрывотні,

Прастудзіўся ў падваротні.
Занядужаў нешта,
Саслабеў дарэшты.
– Не кажы, драч,
Дарэшты –
Горла добра
Дзярэш ты!

**6.** а) Маці сустрэла Кацю. б) Маці сустрэла Каця.

**7.** б) выказнікі
Халодны дождж спачатку ліў, а пасля імжыў бясконца.

**8.** І гэты край, дзе нарадзіўся, рос,
дзе днее, вечарэе і світае,
усё – ад зор далёкіх і да рос –
твая радзіма, родная, святая. (Р. Барадулін)

9. На небе плывуць лёгкія хмаркі.
З лесу выбегла рыжая лісічка.
Над полем ляціць белы бусел.

10. Маленькі Міша хутка едзе на веласіпедзе. Шэрыя хмаркі павольна плывуць па небе. Ярка свеціць вясновае сонейка. Гулка і весела спяваюць на Радзіме пералётныя птушкі.

**11.** Вось узышла перш***ая*** вячэрн***яя*** зорка. Тонк***ія*** лёгк***ія*** хмаркі афарбаваліся ў залаты колер. Белават***ай*** пялёнкаю ўздымаецца густы туман.

**12.** – Стасік, хутчэй сюды! – закрычала Ірынка. – Ласік зноў да птушанят крадзецца.
– Не пусцім на дрэва, Ласік! – прыгразіў дубцом Стасік.

**13.** У нашых лясах жыве вельмі прыгожая птушачка – каралёк. Назву яна атрымала дзякуючы прыгожаму адзенню. Верх у каралька зялёны, грудка шараватая, на кароткіх крыльцах светлая палоска, уздоўж галоўкі з маленькай тоненькай дзюбкай праходзіць яркая чырвона-аранжавая палоска. За гэтую залатую карону яе і празвалі каральком.
* Тэкт-апісанне.
* Сказы па мэце выказвання – апавядальныя.
* У нашых лясах жыве вельмі прыгожая птушачка –

каралёк?

**14.** У каня заўсёды ёсць грыва.

Год, месяц, тыдзень, мінута – гэта час.

### IV узровень

1. Я быў вельмі ра́ды прыезду бабулі. Стройныя рады́ бяроз і ліп радавалі вока.
На́шу карову Рагулю не зблытаеш ні з якой іншай.
Я заўсёды нашу́ доўгую спадніцу.

2. Ціха восенню ў лесе. Апусцелі лясныя паляны. Апалае лісце цудоўным дыванам засцілае зямлю. Адлятаюць у вырай птушкі. Толькі зрэдку прабягаюць асцярожныя жывёлы.

**3.** б) Прыйшла з вятрамі восень, шуміць высокі лес.
в) Сонца яшчэ не зайшло, а на блакітным небе ўжо з’явіўся бледны месяц.

**4.** а) Хто чытае цікавую кнігу?
Што робіць Слава?
Што чытае Слава?
Якую кнігу чытае Слава?
б) Хто падарыў маме прыгожыя кветкі?
Што зрабіла Даша?
Што падарыла Даша маме?
Якія кветкі падарыла Даша маме?

5. Была летняя раніца. Сонца яшчэ не ўзышло, але неба заружавела. На дрэве засвістаў шпак. Ён ужо прыляцеў з выраю. Шпак знайшоў галінку, сеў і абвясціў, што вясна настала.

**6.** Мне здавалася са *(прыназ.)* сну *(наз.)*, што я бачыла сасну *(наз.)*.

**7.** Кожны школьнік павінен ведаць правілы дарожнага руху. Вуліцу трэба пераходзіць толькі на зялёнае святло святлафора. Нельга перабягаць дарогу перад транспартам, які рухаецца. Нельга гуляць на дарозе.
Ведай правілы дарожнага руху!

Пераходзь вуліцу толькі на зялёнае святло святлафора!
Не перабягай дарогу перад транспартам, які рухаецца!
Не гуляй на дарозе!

**8.** На лясным базары мышы купілі лыжы.
Цецярук часта начуе на дрэве.
Халодны вецер з усіх бакоў наскрозь пранізваў.

9. Бацька працаваў на камбайне. Каця села побач. Яны аб’язджалі кругамі жытняе поле. Раніца была ціхая, сонечная. Далёка чуўся гул матора. Камбайн выстрыгаў з загона на залатым моры спелага жыта шырокія прагалы.

Раптам з загона выкацілася спалоханае ад гулу зайчаня і шмыгнула пад абмалочаную салому.

Раптам з загона выкацілася спалоханае ад гулу зайчаня і шмыгнула пад абмалочаную салому.

**10. -** Спалоханае зайчаня, гул матора.
- Працаваў на камбайне, выстрыгаў з загона, выстрыгаў на моры, выкацілася з загона, шмыгнула пад салому.
- Гул матора.
- Працаваў на камбайне, села побач, аб’язджалі кругамі, аб’язджалі поле, далёка чуўся, выстрыгаў з загона, выстрыгаў на моры, выстрыгаў прагалы, выкацілася раптам, выкацілася з загона, шмыгнула пад салому.

**11.** Хлопчык выпусціў з рук папяровага змея.
Дразды вяртаюцца з поўдня ранняй вясной.
Цёмная хмара навісла над зямлёй.
Раніцай сябры адправіліся ў доўгае падарожжа.
Дзяўчынка слухала песні і ласавалася спелымі ягадамі.

**12.** Аднаму здаравеннаму валу здалося, што няма ў свеце нічога такога, што было б яму не пад сілу. Але што б зрабіць такое, каб пераканацца яму ў сваёй магутнасці і іншых пераканаць? І вырашыў вол раку спыніць. Улез па жывот у раку і ўпёрся рагамі ў ваду. А вада як цякла, так і цячэ, абплываючы вала з бакоў. Вол раз’юшана напіраў на ваду, але так нічога зрабіць не змог. З нічым і вылез з вады, ён быў хоць і вол, але, відаць, зразумеў, што мала мець сілу ў рагах, трэба

мець сілу і ў галаве.

**13.** 1) У невялікай вёсцы стаяла хатка. (а)
2) У хатцы жыла старэнькая і нямоглая бабуля. (в)
3) Бабуля мела вялікага, прыгожага і разумнага ката.(д)
4) Яна карміла яго смятанай ды каўбасой. (г)
5) Кот любіў бабулю, суцяшаў яе. (б)

**14.** Зайчык схаваўся ў кустах.
Зубасты кракадзіл плыве да берага.
Самалёт паляціць увечары.

**15.** Я ведаю такіх беларускіх пісьменнікаў: Алаіза Пашкевіч, Кандрат Крапіва, Уладзімір Караткевіч, Якуб Колас, Янка Купала, Змітрок Бядуля…
У Беларусі цякуць вялікія рэкі: Прыпяць, Дняпро, Беразіна, Заходняя Дзвіна, Сож, Нёман.
Абласнымі цэнтрамі ў Беларусі з'яўляюцца гарады: Віцебск, Мінск, Гомель, Брэст, Гродна, Магілёў.

**16.** Канчаецца лета. Але як горача свеціць сонца! На бярозах цінькаюць сініцы. Ластаўкі прабуюць свае крылы. Куды збіраюцца яны? Што гоніць іх ад нас?

## V узровень

**1.** У снежні выпаў мяккі снег.
У маёй маці мяккае далікатнае сэрца.
Мяккі чалавек заўсёды дорыць сваю цеплыню іншым людзям.
Сукенку маёй сястры сшылі з мяккай жоўтай тканіны.

2. **Ц**ераз невялікі бало**ц**істы лу**г** мы прабіра**е**мся да р**а**кі Б**е**р**а**зіны.

Прабіраемся (цераз што?) цераз луг, луг (які?) балоцісты, луг (які?) невялікі, прабіраемся (да чаго?) да ракі, да ракі (якой?) Беразіны.

3. Галодны як воўк; хітры як ліса; баязлівы як заяц; надзьмуты як індык; калючы як вожык; надакучлівы як муха; непаваротлівы як мядзведзь; нямы як рыба.
Міша прыйшоў са школы галодны як воўк. Пасля сваркі з сябрамі Саша быў нямы як рыба.

**4.** Дзеці за лесам знайшлі маленькага вожыка.

**5.** Крынічка

Летнім *(прым.)* днём *(наз.)* па *(прыназ.)* лясной *(прым.)* сцяжынцы *(наз.)* ішоў *(дзеясл.)* дзядуля *(наз.)*. Каля яра сеў ён адпачыць. Стаяла гарачыня. Вельмі хацелася піць. Спусціўся дзядуля на дно яра. ….

…. І цяпер жыве крынічка. Вада ў ёй халодная і празрыстая. Людзі любяць адпачываць каля яе.

**6.** Хлебароба (каго?) поле славіць.

Праца чалавека (каго?) узбагачае, а гультайства псуе.

7. Дзяніска адкрыў маленькую кардонку. Ён убачыў светлы агеньчык. Гэта быў светлячок. Жучок быў падобны на малюсенькую зорачку. Светлячок ляжаў на далоні і свяціў. Які ён зялёны, як у казцы! Хлопчык вачэй не мог адарваць ад гэтага цуда.

Тэкст-апісанне.

**8.** а) Паносіш мазалёў – пад’ясі хлеба.

б) Не раскусіш зерня – не з’ясі арэх.

**9.** Надумаўся вожык госці справіць. Чакаў ён іх, чакаў, ды і не дачакаўся. Крот выбраў дарогу пад зямлёй і абмінуў вожыкаў дом. Бяззубка даплыла да берага і далей не змагла ісці. Конік стаў сабе падковы падбіваць – і ноч наступіла. Адна сараканожка прыпаўзла да вожыкавага дома. Але па дарозе ногі забрудзіла. Пакуль яна чысціла свае сорак ножак, дык вожык лёг спаць.

Тэкст-апавяданне.

**10.** Вясна прыйшла нечакана. З вечара мацнеў востры марозік. Сонца нясмела і лянiва ўставала з-за лесу. А калі паднялося над лесам, усё змянілася.

Шэрань знікла. Сонца расплюшчыла шырока вочы. І ўсё адразу заварушылася. Снег памякчэў, асунуўся. З узгоркаў пабеглі ручаі. На рэчцы лёд пачаў адставаць ад берагоў.

На схілах узгоркаў паказаліся чорныя плямы. Над імі падымалася белая пара. Можна было падумаць, што зямля варушыцца і моцна ўздыхае пасля доўгага зімовага сну.

**11.** Вавёрчын падарунак

Аднойчы я пайшоў у лес. Раптам лясную сцежку мне перабегла вавёрка. Яна ўзабралася на маладую сасонку і з вялікай цікавасцю пазірала на мяне. На пушыстым хвасце рыжай вавёркі чырванеў барвовы асінавы лісток. Я махнуў рукой. Шустрая вавёрка спуджана скокнула на высокую сасну. Чырвоны лісток з пушыстага хваста ўпаў на мой рукаў. З гэтым вавёрчыным падарункам я пакрочыў дамоў.

**12.** Прыехаў Вова да дзеда і бабулі ў госці. Пасля абеду хлопчык пайшоў з дзедам у лес. У бары спявалі птушкі. На прагалінах чырванелі суніцы. Хлопчык слухаў песні і ласаваўся ягадамі. Прабыў ён там з дзедам аж да самага вечара. Хораша ў лесе!

**13.** [н'іска зв'іс'л'і нат з'амл'ой'у
хмары с'н'эгавый'а//
с'в'ішча в'эц'эр за с'ц'аной'у/
у ком'ін'э вый'э// ]

## ЛІТАРАТУРА


1. Абабурка М. В. Беларускае слова і яго вывучэнне. – Мінск, 1986.
2. Арціменя А. І. Беларуская мова. Заняткі па інтарэсах. – Мазыр: РВФ “Белы вецер”, 1997.
3. Бардовіч А. М., Шакун Л. М. Марфемны слоўнік беларускай мовы. – Мінск “Вышэйшая школа”, 1989.
4. Баханькоў А. Я., Гайдукевіч І. М., Шуба П. П.Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. –Мінск “Народная асвета, 1990.
5. Беларуска – рускі слоўнік: у 3 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; Пад рэд А. А. Лукашанца. – Мінск: Беларус. Навука, 2009.
6. Беларускі правапіс у апорных схемах: памятка – падказка . -Мінск. Аверсэв, 2011.
7. Булыка А. М. Слоўнік іншамоўных слоў.- Мінск “Народная асвета”, 1993.
8. Бурак А. І., Юрэвіч У. М. Слова жывое, роднае, гаворкае… - Мінск. – 1998.
9. Брись О. В., Гончарова Г. Ф. Олимпиадные задания в начальных классах: готовимся и участвуем. – Мозырь: Содействие, 2008.
10. Гімпель І. А., Дзіско У. А. Дыдактычны матэрыял па беларускай мове. – Мн.: Нар. Асвета, 1990.
11. Гімпель І. А., Кузняцова Л. Ф. Тэматычны і выніковы кантроль па беларускай мове ў 3, 4 класах. – Пачатковая школа, 2003.
12. Грабчыкаў С. М. Слоўнік паронімаў беларускай мовы. – Мінск “Народная асвета”, 1994.
13. Гришкевич И. К. Предметные олимпиады как средство развития одарённых детей. – Мозырь: Содействие, 2007.
14. Груша М. Ю., Сухаверана. Беларуская мова: чароўны сшытак: 3, 4 клас. – Мінск: Аверсэв, 2007.

15. Гульня – конкурс па беларускай мове і літаратуры. Буслик – 2008.
16. Іўчанка. Беларускі правапіс у апорных схемах: паводле новай рэдакцыі “Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”. – Мінск: Пачатковая школа, 2010.
17. Кандраценя І. У., Кунцэвіч Л. П. Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў: дапаможнік для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовах навучання. – Мінск: Аверсэв, 2011.
18. Королёва Е. В. Предметные олимпиады в начальной школе. – М., 2005.
19. Клышка М. К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў. Мінск “Вышэйшая школа, 1976.
20. Куліковіч У. І. Вучымся пісаць па-новаму: вучэбны дапаможнік па беларускай арфаграфіі. – Мінск. Беларус. Асац. “Конкурс”, 2009.
21. Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т.- Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008.
22. Лозка А. Бібліятэчка народных святаў і прысвяткаў. –Мінск, 1999.
23. Николаева О. М., Трухан Т. Н. Современный русско-белорусский словарь для школьников. – Минск «Літаратура і Мастацтва”, 2009.
24. Паўлоўская В. І. Мова: цікава і займальна. – Мінск: Народная асвета, 1989.
25. Ратнікава І. Э., Роўда І. С. Тэсты па беларускай мове. – Мінск: Таа “Юніпрэс”, 2002.
26. Солахаў А. В. Займальны матэрыял па беларускай мове. – Мінск: ТАА “Лексіс”, 2004.
27. Старычонак В. Д. Займальная філалогія. - Мінск, 1998.
28. Тумаш Г. В. Рабочы сшытак па беларускай мове для 4 класа. – Мінск: Аверсэв, 2002.
29. Хмялеўская А. У. 125 алімпіядных заданняў па беларускай мове для вучняў пачатковых класаў. – Мінск: Жаскон, 2008.
30. Шах Ф. М. Займальная граматыка для пачатковых класаў. – Мазыр: Белы вецер, 2002.
31. Шкраба І. Р. Самабытнае слова. –Мінск,1998.

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** 3

**Раздзелы:**
Арфаэпія. Фанетыка 4
*Адказы* 12
Словаўтварэнне 15
*Адказы* 23
Лексіка 26
*Адказы* 37
Марфалогія 42
Назоўнік 42
*Адказы.* 47
Прыметнік 50
*Адказы* 52
Дзеяслоў. Займеннік. Прыслоўе 53
*Адказы* 56
Арфаграфія 59
*Адказы* 68
Фразеалогія 73
*Адказы* 79
Праца са сказам і тэкстам 83
*Адказы* 93

**Літаратура** 100

Вучэбна-метадычнае выданне

# Пачатковая школа. Алімпіядныя заданні. Беларуская мова

## З вопыту работы

Адказны за выпуск  Грыгарчук Ю. А.

Камп’ютарны набор Андрыца Е.Ч.
Вёрстка Андрыца Е.Ч.